**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**Кафедра беларускай літаратуры і культуры**

**Шамякіна Т.І.**

# КУЛЬТУРА ІНДЫІ

**Матэрыялы для самападрыхтоўкі студэнтаў аддзяленняў беларускай філалогіі, рускай філалогіі і славянскай філалогіі па курсу “Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры”**

**Мінск 2005**

УДК
ББК

Матэрыялы лекцый па курсу “Тэорыя і гісторыя сусветнай культуры” рэкамендаваны да друку саветам філалагічнага факультэта (пратакол № 3 ад 17 лютага 2005 года)

Шамякіна Т.І. Культура Індыі: Матэрыялы для самападрыхтоўкі студэнтаў аддзяленняў беларускай філалогіі, рускай філалогіі, славянскай філалогіі па курсу “Тэорыя і гісторыя сусветнай культуры” – Мінск, РІВШ БДУ, 2005. – 42 с.

# ПРЫРОДНЫЯ ЛАНДШАФТЫ І ВЕРАВАННІ

Індыя, безумоўна, самая цудоўная краіна ў свеце, краіна чараўніцтва і казачнай прыгажосці.

Міфалогія, рэлігія і мастацтва Індыі сфарміраваліся як адлюстраванне яе найбагацейшай прыроды. Менавіта прырода надала асаблівы маштаб, грандыёзнасць індыйскай міфалогіі: фантазія, з якой яна створана, уражвае падчас першага ж знаёмства з ёю. Прырода падказвала многія творчыя рашэнні і мастакам Індыі, спрыяла развіццю самай вытанчанай, самай глыбокай у свеце філасофіі.

На Зямлі няма больш багатых прыродных ландшафтаў. На поўначы – Гімалаі, самая вялікая горная вобласць на планеце: грандыёзны бастыён даўжынёй у 2 500 *км* з гарамі вышынёй больш за 8 000 *м* – месца знаходжання дзівоснай краіны Шамбалы, дзе жывуць звышістоты Махатмы. Ніжэй за Гімалаі – Інда-Ганская раўніна, што раскінулася велізарным паўмесяцам ад Аравійскага мора да Бенгальскага заліва. На гэтай раўніне – палі, стэпы, пустыні, балоты. Нарэшце, трэцяя важнейшая прыродная вобласць Індыі – паўвостраў Індастан, большую частку якога займае плато Дэкан з гарамі (Гаты), узгоркамі і нізінамі, пакрытымі трапічнымі і субтрапічнымі лясамі. Усяго ў краіне 14 тыпаў лесу, 21 000 відаў расліннасці, якая ахоўваецца ў больш чым 20 нацыянальных парках і 200 запаведніках.

Клімат у Індыі даволі своеасаблівы. Фактычна на працягу года змяняюцца тры сезоны: сухі, даволі прахалодны (лістапад – люты); гарачы (сакавік – май); вільготны, гарачы (чэрвень – кастрычнік). Але колькасць ападкаў з года ў год мяняецца, мусонныя дажджы могуць прыходзіць запознена, а заканчваюцца раней: часам іх не хапае, а часам бываюць моцныя паводкі.

Велізарнае значэнне ў гісторыі і культуры Індыі заўсёды мелі рэкі. Як і іншыя вялікія цывілізацыі, індыйская сфарміравалася ў басейне вялікіх рэк – перш за ўсё Інда і Ганга. Рэкі тут свяшчэнныя, бо яны ўвасабляюць жаночы пачатак у свеце.

Індыя – надзвычай старажытная краіна, а яе асноўная рэлігія – індуізм – адна з найстарэйшых на Зямлі. З глыбокай даўніны яна амаль не змянілася, і рэкі па-ранейшаму адыгрываюць у ёй найважнейшую ролю. Міфы Індыі былі сабраны ў кнігах **Веды** яшчэ пяць тысяч гадоў таму. Веды – помнік унікальны, выключны: няма іншага, хоць бы блізкага да іх па моцы фантазіі, па мастацкай вобразнасці. У самай архаічнай з чатырох кніг Ведаў – **Рыгведзе** – ёсць асобны раздзел, прысвечаны рэкам. Ён называецца "Пахвала рэкам" і апісвае водныя артэрыі Пенджаба, а гэта сведчыць пра тое,

што падчас напісання Рыгведы арыйская культура была распаўсюджана толькі на поўначы Індастана, бо Веды – помнік менавіта арыйскі. (Арыйцы, арыі – індаеўрапейскія плямёны, што ў IV-III тысячагоддзях да н.э. насялялі стэпавую зону паўднёва-ўсходняй Еўропы. У канцы II тысячагоддзя да н.э. арыі пранікалі ў Іран і Індыю, што прывяло да гібелі цывілізацыі даліны Інда). Усе назвы рэк у арыйцаў насілі жаночыя імёны, напрыклад, Сіндху, пазней трансфармаваная ў Інду (адсюль і назва краіны). У Ведах падрабязна прасочаны шлях Інды – ад вытокаў у Гімалаях да Аравійскага мора, хоць і не прыводзіцца даўжыня ракі (2 900 *км*).

Жрацоў, складальнікаў Ведаў, не цікавілі сухія лічбы, бо яны, хоць і валодалі матэматыкай, уяўлялі свет паэтычна. Напрыклад, яны пісалі, што Сіндху "падобная да вечна маладой прыгажуні, апранутай у бліскучае адзенне з залатым арнаментам", або што гэта дзяўчына, якая "атрымала ў дар ад багоў бязмежныя прасторы зямлі, здольныя даваць багатыя ўраджаі збожжа".

Самая свяшчэнная рака ў Ведах – Сарасваці. Яе называюць "ракой рэк", "самай шаноўнай сярод маці". Але дзе яна? Такой ракі няма на Зямлі. Магчыма, яна была ў эпоху Ведаў, але чамусьці знікла. Пасля яе найбольш любімая рака ў індусаў – Ганга (менавіта ў жаночым родзе). Яна таксама бярэ пачатак у Гімалаях і ўпадае ў Бенгальскі заліў. Рака мае даўжыню 2 500 *км*, але зноў-такі для індусаў сухія лічбы – нішто. Для іх Ганга – не толькі "Рака Жыцця", але і "Рака Смерці", бо кожны з іх хацеў бы памерці на яе берагах ці хоць бы ведаць, што попел пасля спальвання цела будзе апушчаны ў святую ваду. Паводле слоў вялікага *Джавахарлала Неру*, першага прэм'ер-міністра незалежнай Індыі, "Ганга – сімвал шматвяковай Індыі, яе культуры і цывілізацыі". У Ведах рака мае 108 імёнаў, тыпу: "народжаная ад лотасападобных ступеняў бога Вішну". Штодня ў святым горадзе Варанасі, дзе Ганга лічыцца асабліва гаючай, у рацэ сыходзяцца мільёны людзей – мыюцца, п'юць яе ваду. Сцвярджаюць, што вада Гангі захоўваецца ў пляшках на працягу года і не пратухае, а халерныя эмбрыёны гінуць у ёй праз некалькі гадзінаў. Гавораць, што ў ёй за тры дні могуць растварыцца чалавечыя косці. Сучасныя вучоныя даюць гэтаму наступнае тлумачэнне: Ганга бярэ пачатак у гарах і праходзіць праз радовішча срэбра, пасля чаго яе вада насычаецца часцінкамі каштоўнага металу, які знішчае шкодныя бактэрыі.

Сем рэк Індыі (улічваючы Сарасваці) фармуюць воблік краіны. У сувязі з гэтым варта нагадаць, што, паводле "Вялесавай кнігі", сапраўднасць якой сёння нарэшце прызнае большасць вучоных, – прарадзіма славянаў знаходзіцца ў Семірэччы. Дзе гэта – даследчыкі так і не прыйшлі да згоды. Магчыма, у Індыі?

З усімі галоўнымі рэкамі Індыі шмат чаго звязана ў яе гісторыі ды культуры. Адны з іх цякуць паўз старажытныя храмы і гарады, другія далі жыццё традыцыям музыкі і танцаў, на берагах трэціх былі створаны запаведнікі для птушак, тыграў, сланоў і іншых жывёлаў.

## ЖЫВЁЛЫ ІНДЫІ І ВЕРАВАННІ НАРОДА

Жывёльны свет Індыі ўражвае сваім багаццем нават сёння, не кажучы ўжо пра ранейшыя часы. У краіне маецца 350 відаў млекакормячых, 3 300 відаў і падвідаў птушак, больш за 20 000 насякомых.

Грамадская цікавасць да дзікіх жывёлаў усё больш расце. Турысты ахвотна адпраўляюцца ў лясы Індыі, каб адпачыць ад тлуму шумных гарадоў. Для вельмі багатых людзей наладжваюцца паляванні на экзатычных звяроў. Праўда, рэлігія Індыі здаўна асуджала знішчэнне жывых істотаў. У III ст. да н.э. вялікі імператар *Ашока* забараніў паляванне на пэўныя віды жывёлаў. Аднак усё парушылася падчас каланіяльнага перыяду ў гісторыі краіны. На працягу двух стагоддзяў магараджы былых княстваў, а пазней і брытанскія афіцэры бессэнсоўна знішчалі на паляваннях вялікіх кошак. У выніку азіяцкіх львоў – раней самых звычайных для Індыі жывёлаў – засталося сёння каля 200. Сёння ў Індыі запанавала і раней вядомае меркаванне, што жывыя арганізмы, створаныя прыродай, прама ці ўскосна залежаць адзін ад аднаго, і маральны абавязак чалавека, які інтэлектуальна пераўзышоў усе жывыя істоты, забяспечыць і іх права на жыццё. Сучасныя канцэпцыі нацыянальных паркаў і запаведнікаў Індыі грунтуюцца на спрадвечных для Індыі ідэях міласэрнасці да ўсяго жывога.

Нацыянальнымі жывёламі ў Індыі лічацца тыгр і слон (у нас, беларусаў, – зубр і воўк). На пачатку XX ст. тыграў у краіне было каля 50 000, але да 70-х гг. засталося 1 827. З 1973 г. існуе "Праект Тыгр" па абароне гэтых звяроў. Сёння захаванне тыграў – вялікі грамадскі клопат. Іх ужо каля 3 000 асобінаў.

Сланы здаўна лічыліся мудрэйшымі за людзей. Самка выношвае дзіця каля 20 месяцаў, што з'яўляецца рэкордам ў жывёльным свеце. Звычайна ў сланіхі нараджаецца адно сланяня, вельмі рэдка – два. Па памерах індыйскі слон меншы за афрыканскага, у яго не такія вялікія вушы і біўні, ён намнога лягчэй прыручаецца. Справа, відаць, не толькі ў розуме менавіта індыйскага слана, а і ва ўменні індыйскіх дрэсіроўшчыкаў, у шматвяковых навыках прыручэння. Сланы ніколі не кінуць параненага сабрата, усім статкам клапоцяцца пра сланянятак. Іх

розум, а галоўным чынам, своеасаблівая мараль, сапраўды, уражваюць.

Як у беларусаў свяшчэнным лічыцца бусел, так у індусаў свяшчэнныя карова, малпа, змяя (кобра). Культ быка (каровы) прынеслі з сабою, відаць, арыйцы, а ўшанаванне малпы і змяі звязана з цывілізацыяй дравідаў – абарыгенаў Дэкана.

На вуліцах гарадоў і вёсак Індыі часта можна бачыць быкоў. Але яны вельмі мірныя, і ніхто іх не баіцца. Быкі не ператвораны ў валоў толькі таму, што аддадзены богу. За нараджэнне сына ці другую радасную падзею людзі ў Індыі часта ахвяруюць богу Шыву бычка. Калісьці, у глыбокай арыйскай старажытнасці, быкоў і кароў забівалі, прыносячы ахвяры багам, але паступова іх забойства пачало лічыцца вялікім злом. Сёння такім бычкам – падарункам богу – ставяць на нагу кляймо ў форме трызубца (знак бога Шывы), а падчас розных святаў, якіх у Індыі мноства, залоцяць ім рогі і ўпрыгожваюць кветкамі, стужкамі, карункамі, распісваюць фарбамі. Аднак ніхто не асмеліцца ператварыць бычка ў вала ці выкарыстаць яго на рабоце. У выніку ўсё сваё жыццё такія быкі бадзяюцца, дзе хочуць, як, дарэчы, і каровы, – яшчэ гадоў дваццаць таму бяздомных кароў можна было ўбачыць на цэнтральных вуліцах Дэлі – сталіцы краіны. Сёння каровы сустракаюцца галоўным чынам каля храмаў. Даволі вялікая іх частка сабрана на спецыяльных фермах, дзе праводзіцца селекцыйная работа па паляпшэнні іх пароды і павышэння ўдояў. У 80-я гг. у Індыі прадавалі ялавічыну, хоць забойства каровы здаўна лічылася вялікім грахом. Нядаўна паведамлялася, што ўжыванне ялавічыны зноў забаронена, нават у рэстаранах гатэляў для замежных турыстаў – Індыя вяртаецца да сваіх спрадвечных традыцый. І гэта правільна.

Ушанаванне малпаў звязана, на нашу думку, галоўным чынам з велізарнай папулярнасцю нацыянальнага эпасу "**Р а м а я н а**", дзе цар малпаў Хануман дапамагае галоўнаму герою – Раму. Усё ж гэты культ далёка не такі пашыраны, як культы быка (каровы) ці змяі.

У Індыі ёсць нават свята змеяў – Наг-панчамі. У гэты дзень заклінальнікі змеяў і жыхары тых вёсак, дзе паўзуноў асабліва шануюць, ідуць у лес і прыносяць адтуль кашы, поўныя рэптылій. Іх выпускаюць на вуліцу, пояць малаком, абсыпаюць кветкамі, накідваюць сабе на шыі і падпярэзваюцца імі (!). І змеі чамусьці нікога не джаляць. Дарэчы, такая ж з'ява назіралася ў старажытнасці на востраве Крыт, дзе культ змеяў быў звязаны з ушанаваннем жаночага пачатку ў свеце.

Наг – кобра і толькі кобра. З ім у Індыі звязана незлічоная колькасць міфаў, паданняў, звычаяў. На кобры, якая ўвасабляе ідэю вечнасці, ляжыць у Сусветным акіяне бог Вішну – захавальнік

парадку і гармоніі ў космасе. Пад раздзьмутым капюшонам шматгаловай кобры сядзеў падчас сваіх казанняў Буда, які накіроўваў кобраў на шлях дабра сілаю свайго вучэння. Кобры абвівалі шыю і рукі ўсёмагутнага бога Шывы. Карацей, амаль ва ўсёй індыйскай іканаграфіі ў тым ці іншым выглядзе прысутнічае кобра. Яна і сёння жыве практычна ў кожным індуісцкім храме. Калі ж гэтая істота запаўзае ў дом чалавека, выхаванага ў нацыянальных традыцыях, яе ўспрымаюць як увасабленне душы якога-небудзь продка і ветліва просяць пакінуць дом. У друку сустракаліся сведчанні, што паводкі ці моцныя дажджы выганялі змеяў з норак і вымагалі шукаць паратунку ў вёсках. Тады сяляне пакідалі сваё жыллё, якое займалі кобры, і прасілі заклінальнікаў змеяў – прадстаўнікоў пэўнай касты – вывесці паўзуноў зноў у поле.

Дарэчы, у членаў гэтай касты змеі з'яўляюцца хатнімі жывёламі і жывуць у кожным двары. Калі сям'я перабіраецца ў іншы дом, сямейны жрэц забірае на новае месца і ўсіх змеяў. Прычым змеі ніколі не джаляць сваіх і нейкім дзіўным чынам адрозніваюць ад чужых. Гэта з'ява не унікальная: тое ж назіраецца ў Афрыцы ў плямёнах "леапардаў" і "кракадзілаў". Але ж змеі ў пабытавым разуменні – істоты залішне прымітыўныя, каб прывязацца да людзей. Між тым у Індыі так не лічаць, ды і Хрыстос заклікаў сваіх вучняў быць "мудрымі, як змеі". Тут і навука, відаць, скажа сваё слова, як не раз ужо было апошнім часам, – пацвердзіць народную ісціну, хоць бы тую, што паўзуны на генетычным узроўні запамінаюць сваіх – людзей пэўнай крыві. Але адкуль першапачаткова ўзнікла сувязь паміж людзьмі і змеямі?

Сімвалічна ж змяя ў Індыі – знак энергетычны, а ў больш шырокім плане ўвасабляе сабою энергію ў дзеянні. А вось назапашвалі энергію, захоўвалі яе, на думку філосафаў Індыі, – расліны.

## РАСЛІННЫ СВЕТ ІНДЫІ І ПОБЫТАВАЯ КУЛЬТУРА НАРОДА

Зялёная энергія – галоўнае багацце Індыі. Сапраўды, пад трапічным сонцам фотасінтэз ідзе асабліва інтэнсіўна. Не дзіва, што гэты рэгіён – радзіма многіх культурных раслінаў, якія мігравалі пазней па ўсім свеце, нават ва ўмераны пояс. Гэта: рыс, агуркі, баклажаны, цукровы трыснёг, манга, усе цытрусавыя, бабовыя, мяккія пшаніцы, ячмень, каноплі, гарчыца.

У Індыі ежы заўсёды надавалася выключнае значэнне. Кулінарнае мастацтва развіваецца тут на працягу пяці тысяч гадоў, а ў прыгатаванні ежы ёсць нешта ад старажытнага набажэнства. У краіне існуе незлічоная колькасць страваў, але, бадай, асноўныя прадукты харчавання – рыс, ёгурт, чачавіца і соус карры. Прычым

свой рэцэпт прыгатавання карры захоўваецца практычна ў кожнай сям'і і перадаецца ад маці да дачкі. Соус уключае не толькі розныя спецыі, але і мяса, рыбу, агародніну і садавіну.

Працэс прыгатавання ежы – важная рэч, але вялікае значэнне мае і посуд, у якім яна падаецца. Фарфор і ўвогуле заходні посуд – з'ява новая, і прыхільнікі нацыянальных традыцый яго пазбягаюць. Звычайна ежа падаецца на бананавых лістах або на медным ці сярэбраным падносе, куды ставяцца розныя металічныя кубачкі – для кожнай стравы. Запіваецца ежа простай вадой. Усе ядуць толькі рукамі. Алкаголь практычна не ўжываецца, за выключэннем дамоў, дзе жывуць на заходні манер. У Індыі шмат безалкагольных напояў і сокаў, напрыклад, паўсюды п'юць сок манга, какосавае малако. Салодкае падаецца на кожны абед, гэтых страваў тут – безліч, але, на думку заходніх людзей, у іх залішне многа цукру.

Неабходна адзначыць яшчэ адну важную асаблівасць харчавання ў Індыі. На кухнях вышэйшых кастаў нельга з'яўляцца людзям з кастаў ніжэйшых. Больш за тое, прававерныя індусы неахвотна ядуць побач з чужымі людзьмі. Сумеснае харчаванне, характэрнае для заходніх людзей, індусы ўспрымаюць як вялікі грэх. Есці неабходна паасобку (як і адпраўляць натуральныя патрэбы). Заўважым, што ў Індыі ў застоллі немагчымыя і гутаркі з прэтэнзіяй на філасофію, раскрыццё душы, прынятае ў еўрапейцаў. Тут адкрываюць цела, а душу – не. Своеасаблівая замкнёнасць людзей праяўляецца ў адзіночнай ежы, адзіночных танцах (няма карагодаў ці танцаў тыпу грэцкага "сіртакі", калі ўсе бяруцца за рукі, плечы, паясы), а таксама ў адзіночным сузіранні, медытацыі. Так, на думку сучасных заходніх вучоных, адкрытасць быцця ў Індыі патрабуе закрытасці чалавека, людзей, аддаленасці касты ад касты і г.д. Наадварот, халады, частае дрэннае надвор’е ў Еўропе, у тым ліку на Беларусі, адштурхоўвае ад наваколля, але прымушае яднацца ў грамаду, у грамадства, цясней прыціскацца адзін да аднаго пад страхой дома, вакол ачага. Гэтае тлумачэнне даволі спрэчнае ўжо хоць бы таму, што можна назіраць відавочную адчужанасць людзей у сучасным заходнім грамадстве з яго філасофіяй індывідуалізму, але нешта ад ісціны тут ёсць. Шмат што ў традыцыях Індыі можна растлумачыць яе своеасаблівай этнічнай гісторыяй і сённяшнім дэмаграфічным становішчам. Звычаі і традыцыі былі скіраваны на захаванне чысціні крыві, расавых, нацыянальных прыкметаў.

## НАРОД ІНДЫІ

У Індыі на сённяшні дзень каля мільярда насельніцтва. Тут прадстаўлены ўсе расы Зямлі і шмат змешаных падрасаў. У краіне існуе 187 моў (паводле перапісу 1952 г. у Індыі было зафіксавана

845 моў і дыялектаў): дзяржаўная – хіндзі; афіцыйныя – мовы некалькіх дзесяткаў штатаў; акрамя таго, 13 канстуцыйных моў, на якіх вядзецца навучанне, справаводства, працуюць СМІ, з іх адна мёртвая – санкскрыт, самая дасканалая мова ў свеце; яна захавалася як мова культу, і яе ведаюць усе адукаваныя індусы. На ўсіх жывых мовах выдаюцца кнігі, газеты, часопісы, працуюць радыё і тэлебачанне. У школах абавязкова вучаць родную мову, хіндзі – мову міжнацыянальных кантактаў, і англійскую. Найбольш буйныя канстуцыйныя мовы – хіндзі, урду, бенгалі – індаеўрапейскія. Толькі на поўдні Індастана жывуць народы, што гавораць на мовах дравідыйскай групы.

Вялікія народы Індыі – гэта або арыйцы (вышэйшыя касты), або сумесь арыйцаў з дравідамі. У джунглях і ў цяжкадасягальных горных мясцовасцях захаваліся невялікія народы, якія з'яўляюцца нашчадкамі даарыйскага насельніцтва. Многія плямёны Індыі як бы сімвалізуюць спынены час. Надзвычай багатая культура індыйскіх плямёнаў, магчыма, самы вялікі скарб краіны. Звычайна гавораць, што ў Індыі адначасова жывуць і ў касмічнай эры, і ў каменным веку (ёсць і такія плямёны). І вельмі добра, што ёсць яшчэ краіна, якая захавала велізарную разнастайнасць сваіх традыцый, не поўнасцю уніфікавалася на заходні манер. Прычым тое, як плямёны вырашаюць многія праблемы ў межах сваёй культуры, можа быць павучальным і для сучаснага грамадства.

Увогуле ж Індыя – другая па колькасці насельніцтва краіна ў свеце пасля Кітая: тут жыве адна шостая частка чалавецтва, падзеленая больш чым на 2 000 кастаў.У краіне 3 000 гарадоў, якія ўражваюць сваёй самай сучаснай архітэктурай, і больш за 600 000 вёсак, дзе жывуць яшчэ ў многім патрыярхальна. І ўсё ж можна гаварыць не толькі пра разнастайнасць, кангламерат народаў і расаў, а і пра нацыянальную еднасць, пра унікальны сплаў, які ўвабраў у сябе каласальнае багацце старажытнасці і навейшыя дасягненні навукі і тэхнікі.

Сёння Індыя – сярод дзесяці буйнейшых прамысловых краінаў свету. Яна навучылася ўсё рабіць сама – ажно да касмічных спадарожнікаў. Прагрэс фенаменальны, калі ўлічваць, што яшчэ пяцьдзесят гадоў таму краіна была адсталай калоніяй Брытаніі (Індыя атрымала незалежнасць у 1947 г.). Англія ж, на нашу думку, і цяпер шыкуе за кошт незлічоных багаццяў, вывезеных за два стагоддзі са сваёй самай вялікай калоніі. Прагрэс жа незалежнай Індыі абумоўлены якраз неверагодным багаццем культуры: толькі на яе аснове можна было зрабіць магутнейшы рывок наперад.

# ПЕРЫЯД АРХАІКІ. ІНДЫЙСКАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ

Усю індыйскую культуру, як і егіпецкую, адрознівае ўстойлівасць традыцый. Напрыклад, у эпоху Сярэднявечча індыйскія майстры, як і ў час Архаікі, працягвалі высякаць храмы ў пячорах: у выніку ёсць пячорныя гарады, якія ствараліся на працягу 2000 гадоў. Не менш здзіўляе той факт, што да нашага часу літаратура, тэатр, танец, выяўленчае мастацтва Індыі заснаваны на вялікіх эпасах **"Махабхараце"** і **"Рамаяне".** Менавіта ў глыбокай старажытнасці быў закладзены магутнейшы падмурак культуры. Тады нарадзіліся вобразы такой каласальнай сілы, што і праз тысячагоддзі мастакі чэрпаюць у іх натхненне. Вось чаму важна асабліва пільна ўгледзецца ў старажытную Індыю.

Усёй культуры Індыі ўласціва здзіўляючая адухоўленасць. Для яе – у параўнанні з культурамі грэцкай, рымскай, сучаснай заходняй – характэрна велізарная духоўная сіла, засяроджанасць на ўнутранай свядомасці, на неабходнасці зліцця з Сусветам.

Новыя археалагічныя знаходкі ўсё больш адсоўваюць пачатак культуры Індыі ў глыбіню тысячагоддзяў. Ёсць ужо сёння зусім сур'ёзныя навуковыя тэорыі, якія, шукаючы вытокі індыйскай цывілізацыі, зыходзяць з міфалагічных звестак. Так, у Ведах распавядаецца пра тое, як продкі індусаў жылі на далёкай поўначы вакол Белай гары **Меру** пад нерухомай Палярнай зоркай. На Меру знаходзіцца жыллё багоў, адсюль пачынаецца "нябесная Ганга" – выток усіх зямных рэкаў. Бог Сонца абыходзіць Меру вакол і ніколі не пакідае яе. Каля гары – Малочнае мора, на поўначы якога знаходзіцца Белы востраў – Шветадвіпа**.** Клімат тут мяккі, зямля пакрыта лясамі, дзе водзіцца многа казуляў і птушак.

Апавяданне дзіўнае. Адкуль на поўдні Азіі ведалі пра Палярную зорку, якая нерухомая толькі над Паўночным полюсам? Шмат тут і іншых загадак. Дакладна такая ж краіна апісана ў антычных міфах і названа грэкамі **Гіпербарэяй**. Менавіта з яе паходзіла багіня Лета, якая нарадзіла ад Зеўса вялікіх і слаўных блізнятаў – Апалона і Артэміду, што ўрэшце пачалі атаясамлівацца з Сонцам і Поўняй. Грэкі лічылі жыхароў далёкай Арктыкі блізкімі родзічамі, інакш кажучы, раней яны былі адзіным народам, а пасля раздзяліліся.

Але ж зямлі на полюсе пад Палярнай зоркай няма, там – акіян. Многія вучоныя лічаць, што яна там была – гэта цяперашні хрыбет Ламаносава даўжынёй 1 800 *км*, шырынёй да 200 *км*, які праходзіць побач з полюсам і цягнецца ад расійскай тэрыторыі да амерыканскай. Геолагі гавораць, што зусім нядаўна (па іх мерках) – недзе 12 – 10 тысяч гадоў таму – суша тут захоплівала не толькі хрыбет, які сёння пад вадою, але і шырокую паласу шэльфа, і

астраўныя грады. Некаторыя даследчыкі лічаць, што хрыбет мог апусціцца пад ваду зусім нядаўна – 2500-2000 гадоў таму. Але як там жыць – на полюсе? Тут ёсць такія аргументы. Па-першае, клімат на Зямлі за тысячагоддзі неаднаразова і досыць істотна мяняўся, па-другое, тады Гальфстрым абцякаў не Еўропу, а паднімаўся вышэй і дасягаў цяперашняга полюса, дзе з-за цёплага цячэння быў досыць спрыяльны для жыцця людзей клімат, а Еўропу, наадварот, пакрываў ледавік. Ад сябе дададзім, што і полюс тады знаходзіўся ў іншым месцы (на канадскім паўвостраве Лабрадор), але ў Х тысячагоддзі да н.э. у выніку сутыкнення Зямлі з асцяроідам, названым вучонымі Перуном, планета некалькі нахілілася (на 23,5 градусы), і палюсы перамясціліся. Гіпербарэя пачала пакрывацца лёдам, клімат кардынальна змяніўся, і багі, паводле Ведаў, параілі людзям пакінуць родныя мясціны. Спусціўшыся далёка ўніз, былыя гіпербарэйцы засялілі Алтай, Сярэднюю Азію, Іран, Індыю[1].

Мы коратка выклалі версіі, безумоўна, навукова-папулярныя, але ёсць у свеце вялікая група філосафаў – сярод іх выдатнейшыя, усеагульна прызнаныя – напрыклад, *Рэне Генон*, якія ўвогуле прарадзімай усяго чалавецтва лічаць цяперашнюю палярную зону[2]. Існуе нават плынь у сучаснай філасофіі –"палярна-райская ідэалогія" – вельмі мала вядомая ў нас з-за таго, што яе звязваюць з фашызмам. Але Гітлер успрыняў толькі некаторыя аспекты гэтай тэорыі, ды і тое сказіў іх. Між тым міфы многіх народаў, а сёння ўжо дадзеныя і прыродазнаўчых навук сведчаць на карысць гэтай версіі. Рускі філосаф *Аляксандр Дугін* у кнізе "Гіпербарэйская тэорыя" піша: "Самы старажытны палеа-кантынент размяшчаўся ў Арктыцы. Адтуль паходзіць чалавечая гісторыя і прарэлігія[3]". Факты, якія прыводзіць даслечык, даволі доказныя. Праўда, ён жа у другой сваёй кнізе, "Містэрыі Еўразіі", выводзіць народ Індыі з двух пракантынентаў – Арктыды і Гандваны, што распалася на кавалкі – сучасныя мацерыкі. Дзве вялікія прарасы і стварылі ў Індыі яе дзівосную культуру.

Яшчэ ў глыбокай старажытнасці Індыю называлі "краінай мудрацоў". Археалогія сведчыць, што ўжо ў VII тысячагоддзі да н.э. насельніцтва Індыі вырошчвала многія культурныя расліны, разводзіла буйную рагатую жывёлу (зебу, буйвалаў), кантактавала з народамі Ірана і Сярэдняй Азіі. Падзеі апошняга часу пацвярджаюць надзвычайную старажытнасць індыйскай культуры. Страшнейшы цунамі, які здарыўся 26 снежня 2004 года ў Індыйскім акеане, змяніў

---

[1] Гл.: Жарикова С. Где же вы, горы Меру? // Вокруг света. 1989. № 3. – С. 38 – 41.

[2] Генон Рене. Атлантида и Гиперборея. // Милый Ангел. – М., 1992. Т.1.

[3] Дугин А. Гиперборейская теория. – М., 1993. – С. 3.

берагавую лінію многіх краін, і ў тым ліку Індыі. Адкрыліся раней залітыя вадой тэрыторыі, а на іх – старажытныя гарады, якім 9500 гадоў (!)

Адна з самых яркіх старонак у гісторыі старажытнаіндыйскай культуры – Індская, або Харапская цывілізацыя, адкрытая ў 20-х гг. XX ст. у даліне ракі Інд (сёння яна знаходзіцца на тэрыторыі Пакістана). Яе памеры большыя, чым Егіпет і Месапатамія разам узятыя. На працягу дзесяцігоддзяў вучоныя вядуць спрэчкі пра храналогію харапскай цывілізацыі, таму названыя намі лічбы нельга лічыць абсалютнымі: 3 000 – 1 800 гг. да н.э. Хутчэй за ўсё, будзе даказана яе намнога больш старажытнае паходжанне. А вось канец цывілізацыі ў цэлым ясны: яна загінула ў выніку нейкай катастрофы. На яе зямлю хутка прыйшлі арыйцы, хоць ёсць версія пакістанскіх вучоных, што менавіта арыйцы і знішчылі Індскую дзяржаву.

Харапская цывілізацыя ўражвае сваёй выключнай менавіта цывілізаванасцю. Яе буйнейшы горад – Махенджадара – увогуле самы вялікі на сённяшні дзень з раскапаных старажытных гарадоў на Зямлі. У ім жыло не менш за 100000 чалавек. Пра высокі ўзровень харапскай культуры гаворыць строгая планіроўка гарадоў, манументальная архітэктура, сістэма мераў вагі, пісьмовасць, творы мастацтва. Гарады Махенджадара і Харапа будаваліся паводле пэўных планаў, цэнтральныя вуліцы шырокія – да 10 м і перасякаліся пад прамымі вугламі. Яны былі забрукаваныя, на перакрыжаваннях стаялі невялікія збудаванні для паліцэйскіх ці вартаўнікоў. Басейны меліся ў кожным доме, большасць з якіх будавалася на два-тры паверхі з невялікімі заламі, унутранымі дварамі, туалетнымі пакоямі, падземнай сістэмай каналізацыі. І сёння ўсё гэта можа быць узорам для горадабудаўнікоў і дойлідаў[4].

Асноўныя заняткі насельніцтва ў час Індскай эпохі – сельская гаспадарка і гандаль. Знойдзена і больш за 1000 твораў пісьма. Шматлікія пячаткі з адлюстраваннямі жывёлаў і пэўнымі знакамі пакуль не расшыфраваныя[5]. Сучасныя вучоныя заўважылі іх дзіўнае падабенства да пісьма "кахау-ронга-ронга" з далёкага вострава Пасхі, што ў Ціхім акіяне. Калі зыходзіць з існавання пракантынента Гандваны, такая тэорыя вартая ўвагі.

У Махенджадара знойдзены розныя творы высокаразвітага мастацтва, напрыклад, мноства скульптурак з гліны: птушкі, некаторыя звяры, жанчыны. Скульптуркі жанчын, відаць, увасаблялі багіню-маці, культ якой быў шырока распаўсюджаны ў тагачасным

---

[4] Гл.: Накви А., Ашфак С. Мохенджодаро // Курьер ЮНЕСКО. 1974. № 12. – С. 5 – 13.

[5] Дани Ахмад Хасан. Загадочные письмена долины Инда // Курьер ЮНЕСКО. 1973. № 12. С. 28 – 33.

свеце. Дарэчы, тыя ж скульптуркі сведчаць, што ўжо тады жанчыны Індыі ўпрыгожвалі сябе шыкоўна: карункамі, завушніцамі, шматлікімі бранзалетамі.

Магчыма, менавіта з таго часу ў Індыі лічыцца, што жаночы пачатак – актыўная сіла прыроды, а мужчынскі – пасіўная. У мастацтве Індыі жанчына заўсёды поўная творчай энергіі, жыццёвых сілаў. Увогуле жанчыну тут нязменна лічылі больш блізкай да таямніцаў прыроды, чым мужчыну. Шакці – слова, што літаральна азначае "энергія" – жаночы пачатак, і яго ўшаноўвалі ў вобразах або Дэві, маці багоў, або Кумары – цнатлівай дзяўчыны, або Калі – разбуральніцы ўсяго ліха ў свеце. Аднак у скульптурках з Махенджадара жанчына ўвасабляе ўласна Зямлю-Маці або агонь жыцця, што абуджае, накіроўвае і фармуе стыхійныя сілы прыроды.

Так праз жанчыну злучалася надзвычай багатая, магутная і разнастайная прырода Індыі з яе культурай.

## ПРАБЛЕМА ІНДАЕЎРАПЕЙЦАЎ

Беларусы як этнас належаць да індаеўрапейскай сям'і народаў, і гэта вызначае практычна ўсё: менталітэт, культуру, формы побыту. У параўнанні з такімі глабальнымі паказчыкамі неістотнымі робяцца пэўныя формы праўлення і нават эканамічныя дасягненні.

Праблема паходжання, міграцый, моў і культуры індаеўрапейцаў – адна з найважнейшых агульначалавечых праблем – навуковых і палітычных. У канцы XIX ст. многія вучоныя, пераважна нямецкія, выказалі думку, што прарадзіма індаеўрапейцаў знаходзілася ў Цэнтральнай Еўропе, хутчэй за ўсё – у Германіі. Праўда, ужо тады існавала контргіпотэза: прарадзіма індаеўрапейцаў – Паўночнае Прычарнамор'е (і сёння ў гэтай тэорыі шмат прыхільнікаў).

У 30-я гг. XX ст. у фашысцкай Германіі "арыйцамі" – без усялякіх на тое навуковых падставаў – пачалі называць у асноўным германцаў. На самой справе ў старажытнасці арыйцамі лічыліся толькі індаіранцы. Тым не менш слова прыжылося і пачало шырока ўжывацца ў наш час, праўда, у пашыраным сэнсе – як сінонім паняцця "індаеўрапейцы".

Пошукам прарадзімы індаеўрапейцаў-арыйцаў прысвечана шмат даследаванняў. Ёсць даволі вялікая група вучоных, якія ўпэўнены ў азіяцкіх каранях індаеўрапейцаў – перш за ўсё індыйскіх. У такім выпадку арыйцы, выйшаўшы з Індыі не пазней за VI – V тысячагоддзі да н.э., за некалькі тысячагоддзяў прайшлі па крузе палову Азіі і Еўропы, а ў II тысячагоддзі да н.э. зноў вярнуліся ў Індыю і Іран. Іх прыход у Індыю менавіта ў гэты час – факт бясспрэчны, даўно даказаны.

У 80-я гг. XX ст. у навуцы супернічалі дзве найбольш папулярныя тэорыі генезісу індаеўрапейцаў: адна "выводзіла" іх з Паўночна-Заходняй Азіі, другая – з Паўднёвага Уралу. У апошні час модная стала арктычная (гіпербарэйская) тэорыя.

Такім чынам, версій аб паходжанні інадеўрапейцаў шмат, але ніводная з іх не з'яўляецца агульнапрынятай. У той жа час за апошнія гады самымі рознымі навукамі – ад археалогіі да міфалогіі – назапашана каласальная колькасць эмпірычнага матэрыялу, які яшчэ і яшчэ раз сведчыць пра адзінства культуры індаеўрапейскіх народаў. Адзінства больш арганічнае і глыбокае, чым прынята думаць.

Найбольш паўнавартаснае вызначэнне агульнасці індаеўрапейцаў – лінгвістычнае. У канцы 70-х гг. аказалася магчымым рэканструяваць прамову індаеўрапейцаў. За працу "Индоевропейский язык и индоевропейцы" вядомыя вучоныя Тамаз Гамкрэлідзе і Вячаслаў Іваноў атрымалі Дзяржаўную прэмію СССР. Высветлілася, што індаеўрапейская прамова як "маці" самай вялікай у свеце моўнай сям'і мае шмат адгалінаванняў. Частка іх мёртвыя, частка жывыя. Самая дасканалая з мёртвых моў – санскрыт, якім і сёння валодае інтэлігенцыя Індыі. У германскім адгалінаванні індаеўрапейскай сям'і была, напрыклад, мёртвая мова гоцкіх плямёнаў, што жылі ў сярэдзіне І тысячагоддзя. Апошнія словы гоцкай мовы запісаны на паўвостраве Крым усяго некалькі стагоддзяў таму, а ў Іспаніі да нашага часу зберагліся гоцкія геаграфічныя назвы (ёсць яны, дарэчы, і на Беларусі). На прускай мове (з "галінкі" балтыйскіх моў) гаварылі яшчэ ў XVIII ст. у Прусіі. Мёртвая стараславянская захавалася толькі як мова праваслаўнай царквы. У XX ст. былі выяўлены мёртвыя індаеўрапейскія мовы, на якіх ужо вельмі даўно ніхто не гаварыў. Гэта, напрыклад, мова знойдзеных на тэрыторыі Турцыі клінапісных тэкстаў **Хецкага царства.** Мёртвай з'яўляюцца лацінская і старажытнагрэчаская мовы, але іх значэнне ў тэрміналогіі розных навук і сёння цяжка пераацаніць.

На жывых індаеўрапейскіх мовах у наш час гаворыць каля паловы насельніцтва Зямлі: з 19 найбольш распаўсюджаных 11 – індаеўрапейскія. Самая вялікая "галінка" індаеўрапейскай сям'і – славянская. Гэта руская, украінская, беларуская, польская, чэшская, славацкая, балгарская, славенская, сербская і іншыя мовы. Балтыйскія мовы: літоўская, латышская. Германскія: нямецкая, англійская, галандская, скандынаўскія. Раманскія мовы: французская, іспанская, партугальская, італьянская, румынская і некаторыя іншыя. Кельцкія: ірландская, брэтонская. Іранскія: асецінская, таджыкская, фарсі, курдская, афганская, шматлікія

памірскія мовы. Індаарыйскія: хіндзі, урду, бенгалі і г.д. Ва ўсіх названых жывых моў, як і ў мёртвых, агульным продкам была індаеўрапейская прамова[6].

Рэканструкцыя індаеўрапейскай прамовы дазволіла ў многім высветліць культуру індаеўрапейскіх плямёнаў на іх прарадзіме, дзе б яна ні знаходзілася. Вялікую групу слоў ўзноўленай мовы складаюць назвы хатніх жывёлаў, прадуктаў жывёлагадоўлі і спецыяльных пастухоўскіх тэрмінаў. Але нашы продкі былі і добрымі земляробамі, пра што сведчаць назвы злакаў, садавіны і агародніны (напрыклад: ячмень, пшаніца, лён, яблыня). Вялікае значэнне ў жыцці індаеўрапейцаў (гэта адлюстравалася і ў міфалогіі) меў мёд, прычым не дзікіх пчолаў, а хатніх. Лічыцца, што іх прыручылі ўпершыню ў Егіпце[7]. Найбольш старажытная індаеўрапейская назва пчалы практычна супадае з егіпецкай, што яшчэ раз сведчыць пра еднасць егіпецкай і старажытнаіндыйскай культур.

У праіндаеўрапейцаў ужо існавалі калясніцы, бо захавалася многа назваў калёсных павозак і іх частак. Амаль няма такіх індаеўрапейскіх міфаў, дзе не згадваліся б калясніцы. Яны былі абсалютна аднолькавымі ў грэкаў, скіфаў, германцаў. Дзе калясніцы – там, натуральна, і коні, якіх прыручылі менавіта індаеўрапейцы. Цікава, што біялогія коней спрыяе іх актыўнаму размнажэнню толькі ва ўмеранай зоне, лепш за ўсё – у стэпах Еўразіі. Гэта надзвычай важны аргумент, які даказвае, што прарадзіма індаеўрапейцаў, сапраўды, тэрыторыя Украіны – нашай бліжэйшай суседкі.

Напрыканцы XIX ст. украінскі археолаг В.Хвойка знайшоў пад Кіевам, у старажытным паселішчы Трыполле, выключна дасканалую і своеасаблівую ў формах і арнаменце кераміку. Упершыню свет даведаўся пра новую культуру, якая была названа **трыпольскай.** Амаль сто гадоў яе вывучэння дазваляюць прыйсці да высновы, што на мяжы V – IV тысячагоддзяў да н.э. у Паўднёва-Усходняй Еўропе існавала культура, якую паводле многіх паказчыкаў можна параўнаць з шумерскай. У некаторых сваіх дасягненнях яна была нават вышэйшая за шумерскую. Напрыклад, у Месапатаміі будаваліся невялікія гарады, а ў Трыполлі – гіганцкія (па тых часах) прагарады. Так, дыяметр паселішча Майданецкае дасягаў 1 400 *м*! Нагадаем, што Троя, хоць існавала на дзве тысячы гадоў пазней, мела ў дыяметры ўсяго 300 *м*. Уражвае і плошча прамавугольных, часта двухпавярховых дамоў – 150 – 200 *кв.м.*

[6] Гл.: Беларуская мова: Энцыклапедыя. – Мн., 1994. – С. 229.

[7] Гл.: Орлова С. Индоевропейцы. Кто они? Откуда они? // Знание – сила. 1980. № 11. – С. 20 – 26.

Трыпольцы фарбавалі фасады свайго жытла жоўтай і чырвонай фарбамі і размяшчалі дамы па канцэнтрычных кругах, якія перасякаліся радыяльнымі вуліцамі[8]. Трыпольскую схему горадабудаўніцтва даўно можна лічыць класічнай: хоць былі іншыя планіроўкі, але нічога больш эканамічнага пакуль не прыдумана.

Мы адзначалі, што гарады даліны Інда ўражваюць сваёй цывілізаванасцю. Тое ж можна сказаць пра трыпольскую культуру. Дарэчы, Махенджадара – самы вялікі з раскапаных старажытных гарадоў, а Майданецкае – на другім месцы! Трыпольцы данеслі да нас і сваю выключна багатую на формы і арнамент кераміку, і матывы вышыўкі, і найцікавейшую міфалогію[9], хоць у ёй засталося яшчэ многа нявытлумачанага і загадкавага.

Якраз трыпольцамі быў, відаць, прыручаны конь, і менавіта адсюль рушылі перасяленцы ў Іран і Індыю прыкладна ў II тысячагоддзі да н.э.

Праўда, не толькі трыпольцаў можна лічыць непасрэднымі продкамі індаеўрапейцаў. Мяркуюць, што сюды ў IV тысячагоддзі да н.э. – у сувязі са змяненнем клімату – прыйшлі качавыя азіяцкія плямёны, так званыя ямнікі. Ад іх змяшэння з трыпольцамі і ўзнік надзвычай актыўны, пасіянарны (тэрмін Л. Гумілёва) народ, які, дзякуючы каню, пачаў хутка рассяляцца па прасторах Еўропы і Азіі. Такім чынам, продкі славянаў, якія таксама паходзяць ад трыпольцаў, і продкі індусаў даволі доўга жылі побач – паміж Дунаем і Волгай. Але ў II тысячагоддзі да н.э., прайшоўшы праз Каўказ, арыйцы ўварваліся ў Іран і далей у даліну Кашміра. Пачаўся новы этап у гісторыі індыйскай культуры.

## САЦЫЯЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ІНДАЕЎРАПЕЙЦАЎ

Арыйцы прынеслі з сабою ў Індыю вялікія рэлігійныя помнікі і своеасаблівую сацыяльную арганізацыю. Арыйскае грамадства было падзелена на так званыя **касты,** або варны, якія існуюць да нашага часу і з'яўляюцца асноўнай, найбольш яркай, унікальнай асаблівасцю індыйскага грамадства. Праўда, сёння кастаў больш за 2000, а ў старажытнасці было чатыры (яны і сёння ў аснове тых 2000). Першая – **брахманы** – жрацы, ідэолагі, суддзі, урачы, паэты, духоўныя кіраўнікі грамады. Жрацы-ідэолагі – не толькі ў індаеўрапейцаў і не толькі ў старажытнасці – заўсёды нябачна кіруюць насельніцтвам сваіх краін. Наступная каста – **кшатрыі**. Гэта ваяры – тая даволі вялікая частка грамадства, справай якой была вайна. Трэцяя каста – **вайшы** – асноўная частка народа,

[8] Гл.: Бельская Г. 5 000 лет назад: Триполье. // Знание – сила. 1984. № 3. – С. 23 – 27.

[9] Гл.: Рыбаков Б. Язычество древних славян. – М., 1981

вытворцы матэрыяльных дабротаў: земляробы, пастухі. У час паходу пастухі, безумоўна, мелі важнейшае значэнне: яны не толькі даглядалі жывёлу (арыйцы гналі з сабою велізарныя статкі), але і гатавалі з яе ежу, а таксама выраблялі скуры, рогі, косці. Такім чынам, вайшы – гэта і рамеснікі. У далейшым яны пачалі абменьвацца і гандляваць сваімі вырабамі, зрабіўшыся купцамі. З гэтай жа касты ў асноўным фармавалася тэхнічная інтэлігенцыя. Сам тэрмін "вайша" генетычна блізкі да беларускага слова "вёска", якое ў старажытнасці азначала і грамаду, народ. Чацвёртая каста **шудры** – утварылася ўжо ў Індыі і хутчэй за ўсё з мясцовага насельніцтва. Аднак члены толькі трох першых кастаў называліся "двойчы народжаныя", бо, у адрозненне ад шудраў, яны ў юнацтве праходзілі абрад ініцыяцыі, інакш кажучы, як бы нараджаліся другі раз.

Ініцыяцыя ў архаічным грамадстве была надзвычай складанай працэдурай, падчас якой маладыя людзі павінны былі даказаць сваё права зрабіцца паўнапраўнымі членамі грамады. Яны праходзілі праз шматлікія выпрабаванні, якія сталі, на думку вядомага даследчыка фальклору *У.Пропа*, асновай сюжэтаў чароўных казак, дзе зусім не выпадкова дзейнічаюць, як правіла, тры браты. Яны якраз увасабляюць тры асноўныя касты (або варны) грамадства. Дарэчы, слова "варна" азначае "колер". Сапраўды, члены кожнай касты прытрымліваліся ў сваім побыце пэўнага колеру. Так, брахманам-жрацам адпавядаў белы колер, які атаясамліваўся са святлом, небам, боскай існасцю. Кшатрыі-ваяры мелі сімвалам чырвоны колер, што быў звязаны з агнём і крывёю. Колеры вайшаў у розных плямёнаў вар'іраваліся, але ў асноўным гэта былі чорны, руды (колер зямлі) або сіні (колер вады). Невыпадкова ж трыкалор – белы, чоры, сіні – як бы універсальны каляровы код еўрапейскіх народаў. Кожная варна мела нават і пэўныя масці коней.

Ні адна з кастаў у той час не эксплуатавала іншую, таму іх нельга лічыць класамі. Яны ўяўлялі з сябе не што іншае, як саслоўі, якія дажылі ў Еўропе і ў былой Расійскай імперыі ажно да XX ст. Напрыклад, рэвалюцыю ў Францыі рабіла трэцяе саслоўе – буржуа. У Расіі існавалі дваранства, духавенства, мяшчанства, сялянства, але ў прынцыпе можна было пераходзіць з саслоўя ў саслоўе, напрыклад, праз шлюб. Былі і іншыя магчымасці: селянін, што служыў у войску, за ваенныя подзвігі мог атрымаць дваранства (згадаем Гапона з аднайменнай паэмы *В. Дуніна-Марцінкевіча*). У Індыі гэта немагчыма. Усе шлюбы да нашага часу заключаюцца толькі ўнутры касты. "Прыналежнасць да касты вызначае ўсе звычаі: члены касты нараджаюцца, выхоўваюцца, бяруць шлюб, даюць імёны сваім дзецям, вучаць іх, адпраўляюць усе рытуалы – толькі ў

адпаведнасці з тымі правіламі, якія прадпісаны кожнай касце старажытным рэлігійным законам[10]".

Распавядаючы пра касты, вядомая даследчыца-індолаг Н.Гусева, якую мы вышэй цытуем, адмаўляе гэты інстытут, разглядае яго як рэакцыйны перажытак. Падобным чынам глядзелі на касты ўсе савецкія знаўцы Індыі і журналісты. Мы не згодны з гэтым. Па-першае, сістэма варнаў дазволіла вышэйшым кастам у значнай ступені захаваць чысціню арыйскай крыві, а значыць, і менталітэт, моўныя архетыпы, тыповыя асацыяцыі сімвалаў, увогуле парадыгму культуры. Хіба за гэта мы не павінны быць удзячныя вышэйшым кастам Індыі? Па-другое, менавіта сістэма кастаў абумовіла надзвычай высокі прафесіяналізм індыйскіх дзеячаў культуры і рамеснікаў. Мы сказалі, што сёння кастаў больш за 2000, і вызначае іх перш за ўсё прафесія, якая пераходзіла ад бацькі да сына і практычна не змянялася на працягу многіх пакаленняў.

Кожная каста жыве ў адпаведнасці са сваёй дхармай – нормамі паводзінаў, рэгулятарам учынкаў і нават пачуццяў. Дхарма – тое няўлоўнае, або абсалютнае, на што ўказваюць дзіцяці літаральна з першых яго самастойных крокаў. Нават тып адзення, характар жылля, ежа, посуд – усё сваё ў кожнай варны, усё вызначана спрадвеку і вывучана з дзяцінства. Таму ў Індыі немагчыма выдаць сябе за прадстаўніка іншай касты.

Чалавек адчувае сябе абароненым унутры сваёй касты. Самым страшным пакараннем за парушэнне дхармы з'яўляецца выключэнне з саслоўя – асоба перастае існаваць, як бы поўнасцю выпадае з грамадства.

Безумоўна, з пункту гледжання заходняга чалавека, прывучанага да дэмакратыі, многае ў каставай сістэме Індыі выклікае непрыманне, нават рэзкі пратэст. Напрыклад, людзі ніжэйшых кастаў не мелі права не толькі разам есці і знаходзіцца на кухнях вышэйшых кастаў, але і карыстацца іх калодзежамі, дарогамі, мастамі. Праўда, сучаснае жыццё так ці інакш уносіць свае карэктывы. У вялікім горадзе – у крамах, транспарце, кінатэатрах – даводзіцца не звяртаць увагі на прадпісанні каставага ўкладу. Тым не менш каста дазваляе кожнаму ведаць сваё месца ў грамадстве (як бы сацыяльнае гняздо) і адпаведна валодаць цэлым комплексам неад'емных правоў у межах пэўнай варны.

Некаторыя рэлігіі, напрыклад, будызм, не прымалі каставы ўклад. Але будызм так і не прыжыўся ў Індыі (хоць тут узнік), а касты засталіся. Нават актыўна-ваяўнічы іслам не адолеў варнаў. У наш час заключаюцца міжкаставыя саюзы, якія з'ўляюцца вялікай

---

[10] Гусева Н. Многоликая Индия. – М., 1987. – С. 33.

сілай, маюць немалы ўплыў і нават канкурыруюць з прафсаюзамі і партыямі. Канстытуцыя Індыі не адмаўляе кастаў і дае ім роўныя правы перад законам. Больш за тое, у апошнія гады дзяржава дала шмат перавагаў у набыцці адукацыі менавіта ніжэйшым кастам. На нашу ж думку, касты, аб'яўленыя рэакцыйнымі інстытутам, якраз у значнай ступені цэментуюць індыйскае грамадства, робяць яго маналітным.

## ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА АРЫЙЦАЎ

Жыццё аселых плямёнаў індаеўрапейцаў было непарыўна звязана з дрэвам. Таму невыпадкова, што ў вобразах дрэва наш продак мадэляваў свет. Можна сказаць, што так званае **Сусветнае Дрэва** – гэта адзін з найбольш універсальных вобразаў культуры, вынік пазнання рэчаіснасці і сімвал асэнсавання Космасу. Эмблемай дрэва ў старажытных арыйскіх рунах, якія рэканструявалі некаторыя даследчыкі, быў васьміканцавы крыж або зорка. Такі крыж можна ледзь не на кожным кроку бачыць на архітэктурных збудаваннях Індыі. У даправаслаўных славянаў васьміканцавая зорка азначала прысутнасць Вышэйшай Існасці. Яе выява была на адзенні, на многіх прадметах побыту і культу. У праваслаўных краінах гэта **Віфлеемская зорка.** Акрамя таго, васьміканцавы крыж прысутнічае на ўсіх вобразах Божай Маці, малюецца на яе плячах і галаве.

Пра значнасць дрэва ў Індыі сведчыць хоць бы той факт, што царэвіч *Гаутама* зрабіўся Будам, седзячы пад свяшчэнным дрэвам сал, якое можна лічыць аналагам Сусветнага Дрэва.

Другі важнейшы метафізічны сімвал арыйцаў – свастыка. Многія людзі шчыра ўпэўнены, што яе прыдумалі германскія нацысты. Але гэты зрынуты сёння сімвал існаваў за тысячы гадоў да "Трэцяга рэйха" ў агульнапрызнаных шэдэўрах сусветнага мастацтва і ў народнай культуры.

У перакладзе з санскрыта слова "свастыка" азначае "носьбіт дабрыні". Гэта сімвал Сонца, Агню і таму ён адпавядае паняццю сілы, шчасця, дабрабыту, поспеху.

Свастыка – адзін з найбольш старажытных сімвалаў у гісторыі чалавецтва ўвогуле. Яна сустракаецца ў выглядзе арнаменту (так званы меандр) на зробленых з біўняў маманта бранзалетах і скульптурах, якія былі знойдзены недалёка ад Беларусі, у Чарнігаўскай вобласці. 20 000 гадоў гэтым знаходкам.

У антычны перыяд свастыку шырока выкарыстоўвалі грэкі, траянцы, рымляне. Пасля прыходу арыйцаў у Індыю яна стала вядомай у краінах Усходу – ажно да Японіі. І сёння свастыка шануецца ў індуізме і будызме. Гэта патрэбна ведаць, каб не здзіўляцца і не жахацца, сустрэўшыся з такога кшталту арнаментам.

Свастычная сімволіка ўпрыгожвала старажытны славянскі посуд. Асабліва ўражвае колькасць адлюстраванняў свастыкі ў народнай вышыўцы. Прычым часцей за ўсё ў арнаменце арыйскіх народаў сустракаецца так званая сустрэчная свастыка – своеасаблівы ўзор, які на першы погляд не ўспрымаецца свастычным. У ім рух ліній направа сімвалізуе эвалюцыю асобы, жыццё індывіда; рух налева – развіццё свету, грамадства. Абодва працэсы зліваюцца ў адным знаку. У арыйцаў ён называўся "зэрвана" – знак Абсалютнага, Агульнага Шляху.

Некаторыя даследчыкі суадносяць свастыку з полюсам і чатырма бакамі свету. А паколькі полюс і зеніт супадаюць з містычным Цэнтрам Свету, свастыка павінна азначаць уздзеянне Пачатку (інакш кажучы, бога Брахмы) на Сусвет.

Арыйцы прынеслі з сабою і сваіх багоў, пра якіх распавядаюць Веды. Міфалогія прадстаўлена ў іх з вычарпальнай паўнатой: няшмат народаў пакінула нашчадкам настолькі падрабязныя звесткі пра свае раннія вераванні.

Галоўным прынцыпам светапогляду ў Ведах было абагаўленне прыроды як цэлага, увасабленнем якога выступалі асноўныя багі пантэону[11]. Праўда, гімны Ведаў праслаўляюць подзвігі багоў, расказваюць пра розныя падзеі з іх удзелам, але амаль не даюць характарыстык фізічнага вобліку. Напрыклад, пра бога Сонца (**Сур'ю**) толькі напісана, што ён мае калясніцу, запрэжаную сямёркай коней, і рукі з золата. Нідзе не згадваюцца і атрыбуты бога Ветру (**Ваю)**, які вельмі шанаваўся і праслаўляўся ў многіх гімнах (ён быў, відаць, каставым богам кшатрыяў).

Пазнаёмімся больш падрабязна з пантэонам арыйскіх багоў. Яшчэ ў V ст. грэцкі філосаф *Прокл* распрацаваў у сваіх "Першаасновах тэалогіі" асноўныя прынцыпы, паводле якіх будуецца пантэон багоў у любой міфалогіі. Першы ўзровень вышэйшых істотаў – тыя, хто нараджае Быццё. Далей ідуць багі, якія даруюць Жыццё. Нарэшце, трэці ўзровень багоў – формаўтваральнікі[12]. Паводле гэтага падзелу, утваральнікам светабудовы быў, на нашу думку, **Варуна** (параўнаем з грэцкім богам неба **Уранам**), ён жа і даравальнік вады (параўнаем з імем славянскага бога таго ж кораня **Перуна**). Як уладар свету Варуна ўсталяваў парадак ў прыродзе[13], але не саму прыроду. Інакш кажучы, ён толькі заклаў Прынцып, асноўны Закон Светабудовы.

---

[11] Гл.: Бонгард-Левин Г. Древнеиндийская цивилизация. Философия. Наука. Религия. – М.. 1980. – С. 32 – 33.

[12] Гл.: Парнов Е. Боги Лотоса. – М., 1980. – С. 72.

[13] Гл.: Иллюстрированая история религий: В 2 т. Т.2. – Карелия, о. Валаам, 1992. – С. 23.

Характэрна, што імя "Варуна" суадносіцца з імем першабога тых арыйскіх плямёнаў, якія засталіся на прарадзіме, на цяперашніх славянскіх землях, – з імем **Сварога**.

Але найбольш папулярны і любімы сярод ведыйскіх багоў – **Індра.** Заўважым, што частка яго імя супадае з назвай свяшчэннай ракі Інд і з назвай краіны. Мяркуюць, што слова "інд" азначала "звышістота", "герой". Другая ж частка імені Індры – ра – назва Сонца не толькі ў старажытным Егіпце, але і ўвогуле ў вельмі архаічных культурах. Гэты ж склад захаваўся ў некаторых славянскіх словах: "ра-дасць", "ра-ніца", "ра-даўніца", "ра-дуга", "ра-душие" і г.д. Такім чынам, Індра – як бы "Сонечная Істота". Звычайна даследчыкі называюць яго грымотнікам, богам маланак і перуноў, але перш за ўсё ён – стваральнік касмаганічнага акта, уласна прыроды. Подзвіг Індры, які перамог дракона Урытру – увасабленне Цемры і Хаосу, – суадносіцца з зімовым сонцапаваротам[14]. Пазней ён – уладар сонца і дажджу. У Індры была жонка – Індрані (цікава, што ў сучаснай Летуве захавалася жаночае імя – Індра).

Да таго ж узроўню багоў, што і Індра, належылі бог Сонца **Сур'я** і бог агню **Агні.** Ва ўсіх арыйцаў быў культ сонца і агню. У сучаснай Індыі захаваліся храмы, прысвечаныя богу сонца, але ўсё ж найбольш шануемы сёння з ведыйскіх багоў – Агні. Яго можна разглядаць і вельмі канкрэтна – як уласна полымя, якое, дарэчы, прысутнічае ў кожным доме, і абстрактна – як агонь душы, агонь кахання, агонь творчасці. Усе названыя багі – даравальнікі Жыцця.

У Ведах згадваюцца і іншыя арыйскія багі ды багіні. Адна з іх – **Адзіта,** якая ўвасабляе Зямлю і матчын пачатак у Сусвеце. Корань тут той жа, што і ў слове "Адам". У санскрыце корань "ад" мае значэнне – адзіны. Сапраўды, Зямля – адна. Менавіта яна нараджае ўсё багацце прыродных формаў. Яна бласлаўляе і апякуе жывых, унтуры яе жывуць таксама і памерлыя. Культ Маці-Зямлі застаўся ў беларусаў да нашага часу і ў многім зліўся з культам Божай Маці.

Неабходна падкрэсліць, што Веды апавядаюць пра багоў розных часоў: і тых, каго арыйцы шанавалі на сваёй прарадзіме, і тых, хто з'явіўся ўжо на новых землях. Адзін з найбольш старажытных ведыйскіх багоў – **Рудра** (што значыць, напэўна, руды), які шанаваўся найбольш у касты вайшаў (Варуна – у брахманаў, Індра – у кшатрыяў). Рудра апісаны як бог страшны і ў той жа час апякун жывёлы, бог гор і лясоў. На нашу думку, Рудра вельмі нагадвае многімі сваімі рысамі таго бога, што застаўся ў

[14] Гл.: Дьяконов И. Архаические мифы Востока и Запада. – М., 1990. – С. 142.

Еўропе, – **Вялеса** (Воласа, Велса). У далейшым Рудра – прататып магутнейшага з багоў індуізму – **Шывы**.

## ЛІТАРАТУРНЫЯ ЭПАСЫ ІНДЫІ

Веды – помнік першага перыяду жыцця арыйцаў у Індыі – збор самых розных тэкстаў: гімнаў, казанняў, легендаў, філасофскіх дыялогаў, міфаў і г.д. Паняцце "Веды" неабходна разумець як "найвышэйшыя, свяшчэнныя веды". Прычым яны аднолькава шануюцца як індуістамі, так і будыстамі. Усяго вядома чатыры Веды – "Рыгведа", "Самаведа", "Яджурведа" і "Атхарведа", але найбольш значная ў эстэтычных адносінах і найбольш ранняя – "Рыгведа" (веда гімнаў).

Веды – усё ж помнік рэлігійнага характару. Між тым ў канцы II тысячагоддзя і ў I тысячагоддзі да н.э. (індыйскія вучоныя называюць намнога больш раннія часы) арыйцы стварылі дзве вялікія эпічныя паэмы, якія зрабіліся вытокам пераймання і натхнення літаральна для ўсіх індыйскіх паэтаў, мастакоў, філосафаў ад старажытнасці да нашых дзён. "Махабхарата" і "Рамаяна", бясспрэчна, самае вялікае літаратурнае дасягненне не толькі індусаў, але і ўсіх індаеўрапейскіх народаў. Немагчыма лічыць сябе культурным чалавекам, не ведаючы індыйскія паэтычныя эпасы, бо на іх заснавана – без перабольшання – уся індыйская мастацкая культура.

"**Махабхарата" –** велізарны твор, разоў у восем большы за "Іліяду" і "Адысею" разам узятыя. Паэма распавядае пра барацьбу за ўладу паміж двума царскімі родамі – кауравамі і пандавамі. У прынцыпе, эпас перадае сапраўдныя падзеі прыкладна XV-X ст. да н.э., калі арыйцы заваёўвалі паўночную Індыю і раздзялялі паміж сабою захопленую краіну.

Здзіўляючай рысай "Махабхараты" з'яўляецца тое, што асноўны сюжэт пра барацьбу стрыечных братоў каураваў і пандаваў займае толькі чацвёртую частку ўсёй паэмы. Астатні тэкст – устаўныя эпізоды: міфы, легенды, апавяданні, байкі, прыпавесці, філасофскія, палітычныя, маральна-этычныя трактаты. Некаторыя з іх утвараюць як бы самастойныя творы, што самі з'яўляюцца шэдэўрамі сусветнай літаратуры. Такая дзіўная структура адрознівае "Махабхарату" ад іншых класічных народных эпасаў.

Сярод устаўных эпізодаў "Махабхараты" асабліва цікавая "Паэма пра Наля". Галоўны герой твора праіграў брату ў косці сваё царства і ўсю маёмасць. Разам з каханай царэўнай Дамаянці прынц Наль блукае па лесе, затым лёс раздзяляе іх, яны перажываюць шмат прыгодаў і нарэшце сустракаюцца зноў. У творы цудоўна перададзены перажыванні герояў, сімволіка і мова кахання,

вернасці, гора і радасці. Паэма прасякнута незвычайнай для старажытнай літаратуры рамантыкай пачуцця. Гэта адзін з лепшых твораў сусветнай літаратуры пра каханне. Прычым схема яго – як бы формула сюжэту – пасля паўторыцца ў шматлікіх творах персідскай, а затым і антычный літаратуры (напрыклад, у “Дафнісу і Хлоі” Лонга).

Устаўныя эпізоды "Махабхараты" пераказваюць, па сутнасці, усю індыйскую міфалогію. Тут і міфы пра старых багоў, з якімі арыйцы ішлі ў Індыю, тут і новыя багі – Брахма, Вішну, Шыва, – міфы пра сусветны патоп і многія іншыя.

Такім чынам, "Махабхарата" – звод самых розных сюжэтных тэкстаў. Некаторыя даследчыкі лічаць, што гэта не адзіны твор, а цэлая літаратура. Гэта сапраўды так, бо эпас складваўся цэлае тысячагоддзе. Народная індыйская прыказка гаворыць: "Чаго няма ў "Махабхараце", таго няма ўвогуле ў Індыі", інакш кажучы, у эпапеі ёсць літаральна ўсё. Гэта свяшчэнная і мудрая кніга пра сэнс і мэту жыцця, пра чалавечую мараль і абавязак.

Другі класічны індыйскі эпас "Рамаяна" пабудаваны зусім інакш: ён пераносіць чытачоў у казачны свет. Тут перададзены падзеі таго перыяду ў гісторыі Індыі, калі арыйцы рухаліся ўжо на поўдзень краіны, заваёўваючы ўвесь Дэкан. У паэме адбілася барацьба чорнай і белай расаў.

Галоўны герой твора – Рама. Заўважым, што і яго імя мае склад “ра”. Дарэчы, тэосафы, ведаючы некаторыя старажытныя манускрыпты, лічаць Раму царом і вышэйшым магам арыйцаў, які якраз і прывёў іх у Індыю. "Эпічнае паданне Індыі прыпісала Раме заваяванне Цэйлона, апошняга прытулку чорнага мага Раваны... якога Рама перамагае разам з войскам малпаў, што надзвычай нагадваюць першабытныя плямёны дзікуноў, натхнёных гэтым вялікім чарадзеем”[15]. Пазней імя міфалагічнага звышгероя перайшло ў літаратурны твор – найбольш любімы ў індыйскага народа да нашага часу.

Сюжэт паэмы ў вельмі кароткім пераказе наступны. Рама, старэйшы сын цара, жыў шчасліва са сваёй жонкай Сітай. Інтрыгі мачахі прымушаюць яго разам з братам і Сітаю збегчы з дому. Жывучы ў лесе, Рама пакрыўдзіў лясную дземаніцу, якая паскардзілася свайму брату – магутнаму ўладару вострава Ланкі (Цэйлона) дзесяцігаловаму цмоку Равану. Равана крадзе Сіту і пераносіць яе па паветры на Цэйлон. Тут ён спакушае жанчыну багаццем, раскошаю, але Сіта застаецца вернай жонкай. Пасля многіх прыгодаў Рама са сваім войскам, якое ўключае жывёлаў –

---

[15] Шюре Э. Великие Посвящённые. – Калуга, 1914. – М., 1990. – С. 41.

малпаў ды мядзведзяў, – перапраўляецца на Цэйлон і перамагае Равану. Праўда, Сіту ён падазрае ў нявернасці, але бог Агні пераконвае героя ў чысціні жонкі. Рама і Сіта з перамогаю вяртаюцца ў Індыю, дзе Рама робіцца царом. Але яго не пакідаюць пакуты рэўнасці. Сіта вымушана зноў сысці ў лес, дзе яна нараджае двух хлопчыкаў-блізнятаў. Аскет-ёг Вальмікі вучыць іх, расказвае пра подзвігі Рамы. Калі сыны падрастаюць, Сіта прыводзіць іх да Рамы. Той пазнае падобных да яго хлопчыкаў і тым не менш зноў патрабуе ад Сіты доказу чысціні і вернасці. Сіта звяртаецца як да сведкі да маці-Зямлі і просіць паглынуць яе. Зямля растулаецца і паглынае Сіту. Толькі пасля смерці, у іншасвеце, Рама і Сіта нарэшце сустракаюцца.

Такім чынам, сюжэт паэмы трагічны. Дамінуючы матыў – немагчымасць для блізкіх людзей быць разам. Тут шмат і пабочных ліній, устаўных эпізодаў. Многія з іх пазнаюцца ў нашых казках. Паэма вельмі лірычная. У ёй часта сустракаюцца маналогі герояў, у якіх яны выказваюць свае пачуцці. Асабліва вядомы маналог Рамы, калі ён вяртаецца ў лясны будан і не знаходзіць там Сіты, выкрадзенай Раванам. Ён бегае па лесе, шукае, кліча, пытаецца пра яе ў розных сілаў прыроды, звяртаецца да рэк і гор, да ветру і сонца (гэта нагадвае "Плач Яраслаўны" ў "Слове аб палку Ігаравым").

Стыль паэмы незвычайны. Для яго характэрны перш за усё дэталізаваныя і надзвычай маляўнічыя апісанні, сярод якіх найважнейшае месца належыць апісанням прыроды. Увага да прыроды, сувязь паміж прыроднымі з'явамі, жывёламі і чалавекам – галоўная рыса паэмы. Упершыню ў "Рамаяне", а пасля на яе ўзор ва ўсёй эпічнай індыйскай паэзіі дадзены разгорнутыя апісанні пораў года. Такім чынам, тое, да чаго ішла ўся еўрапейская літаратура на працягу двух з паловай тысяч гадоў, у Індыі было яшчэ да пачатку Антычнасці[16].

Нам цяжка нават уявіць, якое велізарнае значэнне надаецца ў Індыі "Рамаяне". Ды і не толькі ў Індыі, але і ў краінах так званага кола індыйскай культуры – у Непале, Інданезіі, Шры Ланцы, у краінах Індакітая. Увесь народны тэатр тут заснаваны на матывах з "Рамаяны". Паэты, драматургі не перастаюць інтэрпрэтаваць яе сюжэт. Героям эпасу прысвечаны творы жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-побытавага мастацтва. Сіта – ідэал індыйскай жанчыны, на яе прыкладзе выхоўваюць дзяўчат. Адно з важнейшых святаў Індыі Дывалі, або асенняе Свята Агню (у беларусаў яму адпавядала свята Пасвету на дзень асенняга раўнадзенства),

[16] Паводле: Серебряков И. Очерки древнеиндийской литературы. – М., 1971.

адзначаецца як памяць таго дня, калі вялікі і неператожны Рама вярнуўся ў родную краіну пасля сваіх падарожжаў.

Як бачым, Індыя – адзіная ў свеце краіна, дзе літаратура вызначыла ўсё развіццё культуры на працягу тысячагоддзяў.

## РЭЛІГІІ ІНДЫІ: БУДЫЗМ

Будызм – адна з самых магутных сусветных рэлігій: па колькасці вернікаў яна займае трэцяе месца ў свеце. Гэта імкненне стварыць рэлігію без Бога, але ўрэшце сам Буда аказаўся абагоўлены.

Пра жыццё Буды ў рэлігійнай літаратуры існуе мноства апавяданняў, апокрыфаў, легендаў. Вылучыць з іх ісціну даволі цяжка, але нельга не пагадзіцца, што Буда як рэальная асоба, хутчэй за ўсё, існаваў. Праўда, вакол яго жыцця ўтварылася свая – надзвычай багатая – міфалогія. Таму варта крытычна ставіцца да ўсёй каласальнай колькасці паданняў пра Буду.

Нарадзіўся вялікі прарок у траўні 623 г. да н.э. – гэта адна з нямногіх пэўных датаў у індыйскай гісторыі. Адышоў у нірвану ў 543 г. да н.э. Такім чынам, Буда быў сучаснікам вялікіх яўрэйскіх прарокаў, антычных філосафаў і кітайскага мудраца *Канфуцыя*.

Пасля таго, як багі абвясцілі неабходнасць увасаблення Буды на зямлі, ён сам вырашыў, дзе яму нарадзіцца, у якой маці і ў якім канкрэтна чалавечым целе. Зачацце ў яго маці *Майі* суправаджалася рознымі незвычайнымі працэсамі ў прыродзе. Пасля нараджэння дзіцяці многія мудрацы-брахманы адразу ўбачылі ў ім ясныя прыкметы будучага Буды.

Імя прарока на зямлі – *Гаутама*, ён царэвіч з касты кшатрыяў. Нагадаем, што гэта каста ваяроў, з якой заўсёды выбіраліся цары. Праўда, існуе іншая версія: бацька Гаутамы не быў царом – ужо пасля міф пра Гаутаму пераўтварыў яго ў царэвіча[17]. Як бы там ні было, а бацька як мог аберагаў сына ад ведання негатыўных бакоў жыцця. Паводле легендаў, Гаутама жыў у такой роскашы і настолькі лёгка, шчасліва, бесклапотна, што да 29 гадоў абсалютна не ведаў пра такія з'явы, як беднасць, хваробы, смерць. У яго былі жонка-прыгажуня і сын. Але аднойчы ён убачыў старога чалавека, нябогу, аскета-манаха і нябожчыка. Чатыры сустрэчы вызначылі далейшы лёс царэвіча. Ён быў настолькі ўражаны сваім адкрыццём, што сышоў з дому і пачаў вандраваць, імкнучыся знайсці адказы на пытанні, якія хвалявалі яго: Хто мы? Адкуль мы? Куды ідзём? Чаму людзі асуджаны на пакуты? У чым вышэйшы сэнс быцця?

[17] Парнов Е. Кольца Змея. – М., 1996. – С. 616.

Сем гадоў Гаутама шукаў ісціну ў свяшчэнных таямніцах жрацоў-брахманаў, у аскетызме ёгі, доўга жыў адзін у джунглях і пячорах. Пакутлівы роздум не пакідаў яго. Нарэшце былы царэвіч спыніўся каля горада Гая, сеў пад вялікім дрэвам і ўрачыста даў сам сабе слова, што не ўстане з месца, пакуль не разгадае загадку чалавечага быцця. Злы дух Мара спакушаў Гаутаму, але царэвіча ўжо не вабілі ніякія зямныя даброты. Безумоўна, сумненні не пакідалі яго, і ўсё ж на 49-ы (7х7) дзень яму адкрылася Вышэйшая Ісціна – і Гаутама зрабіўся **Будам,** што значыць "свядомы", "прасветлены".

Адзін з найбольш распаўсюджаных сюжэтаў індыйскага мастацтва – першая казань Буды, які ўжо зразумеў прычыну чалавечых пакутаў, у парку каля горада Варансі на рацэ Ганг – цяпер свяшчэннага горада Індыі. Казань называлася "Кружэнне каляса кармы". Яна такая ж важная, як і Нагорная казань Хрыста: у ёй адлюстраваная квінтэсенцыя новага вучэння. Сутнасць яго: існаваць – значыць пакутаваць; прычына пакутаў – жаданні; пазбягаць пакутаў – пазбавіцца ад жаданняў. Інакш кажучы, шлях чалавека да шчасця ў пазбаўленні ад залішніх патрэбаў, у сузіранні, у самаўдасканаленні.

Праўда, пакуль душа знаходзіцца ў матэрыі і пераходзіць з цела ў цела (рэінкарнацыя), яна ўсё ж асуджана на пакуты. Цела – як турма для яе. Менавіта ў вандроўках душы, у кружэнні каляса **кармы** – прычыны няшчасцяў чалавека. Найвялікшае шчасце – вызваленне ад кармы, прарыў кола, выхад душы з цела, яе поўная свабода, зліццё з Абсалютам-Вечнасцю. У будызме такі стан – абсалютнай свабоды душы – называецца **нірванай**. У прынцыпе заходняму чалавеку зразумець філасофскае паняцце "нірваны" даволі складана, бо мы жывём паводле іншых законаў логікі. Нірвана – гэта адначасова існаванне і неіснаванне. Зразумела, што гэта працяг чалавека ў нейкім іншым стане. Але ў якім?

Задачы Буды, яго вышэйшая місія – урэшце давесці ўсе душы да Нірваны, па сутнасці – да Выраю. Будызм выпрацаваў і паняцце бадысатваў (падобна анёлам у хрысціянстве). Гэта людзі, якія шляхам самаўдасканалення ўжо дасягнулі Нірваны, але на пэўны час адмовіліся ад яе, добраахвотна засталіся на зямлі, каб дапамагаць іншым. Калі іх намаганнямі свет наблізіцца да дасканаласці, тады з'явіцца апошні Буда Майтрэя, які цяпер сціпла жыве ў нейкіх вышэйшых сферах, і ўстановіць Рай, цудоўную краіну Шамбалу, у якой усе зробяцца "будамі" – прасветленымі.

Гістарычны Буда, як і *Хрыстос,* меў вучняў. Увогуле, мараль будызму блізкая да хрысціянскай: вернікі шануюць Буду як Бога, не шкодзяць жывому, не крадуць, не хлусяць, пазбягаюць пачуццёвай

асалоды, не ўжываюць алкагольныя напоі. Ужо гэтым яны забяспечваюць сабе добрую карму. Але не Нірвану. Для яе дасягнення неабходны манаскі шлях. У краінах, дзе будызм з'яўляецца асноўнай рэлігіяй, будысцкіх манастыроў многа – нават залішне. У Тыбеце адзін сын з кожнай сям'і абавязкова ідзе ў манахі. Магчыма, гэта абумоўлена нават эканамічна-гаспадарчымі прычынамі. У гарах не хапае на ўсіх урадлівай зямлі, а манахі – аскеты, у іх не можа быць дзяцей. Так, відаць, абмяжоўваецца рост насельніцтва. А з другога боку, сяляне вымушаны карміць процьму здаровых мужчын. Прычым манах лічыцца тым больш бязгрэшным, чым менш ён дзейнічае. Таму дзейснае, актыўнае дабро для манахаў не характэрна, хоць высокая мараль – аснова будызму.

Будызм – надзвычай жыццяўстойлівая рэлігія. Гэта можна вытлумачыць дзвюма прычынамі. Першая – рэлігійнае міралюбства: будызм ніколі не звяртаўся да агню і мяча, як каталіцызм, ніколі не насаджаўся сілаю – толькі праз заваяванні сэрцаў. А другая прычына тая, што ён лёгка ўспрымаў мясцовыя культы, але заставаўся верным асноўнаму Вучэнню. Акрамя таго, Буда не быў прыхільнікам поўнага аскетызму, як прынята лічыць. Сапраўды, калі ўсе будуць манахамі, хто ж будзе карміць? Буда прапаведаваў сярэдзінны шлях: аскетызм – для выбраных, а астатнім пажадана не грашыць. Нірвана абяцалася толькі ў іншых жыццях, а пакуль не варта адмаўляцца ад звычайнага чалавечага існавання – неабходна зведаць усё і, безумоўна, расчаравацца, але на падставе жыццёвага вопыту.

Перад смерцю Буда назваў свяшчэннымі чатыры гарады: дзе ён нарадзіўся, дзе дасягнуў вышэйшага прасвятлення, дзе ўпершыню прапаведваў і дзе ўвайшоў у Нірвану. Праўда, усе гэтыя месцы ўжо лічыліся святымі ў індуістаў, але па іншых прычынах. Буда размеркаваў і рэліквіі, звязаныя з яго жыццём і смерцю. Да нашага часу ўшаноўваюць яго зуб, некалькі валасінаў і сляды ног.

Пражыў Буда ў чалавечым целе роўна 80 гадоў і памёр пад свяшчэнным дрэвам сал (відаць, фікусам), папрасіўшы любімага вучня *Ананду* зрабіць магілы над часткамі яго спаленага цела. Прах Буды падзялілі на восем частак і пабудавалі капліцы (ступы) над кожнай.

Пасля адыходу Буды ў Нірвану яго вучэнне шырока распаўсюдзілася ў Індыі і ў іншых краінах Азіі, прычым мірным шляхам. Будызм выступаў супраць складаных рытуалаў, адмаўляў падзел людзей на касты, але ў прынцыпе цалкам знаходзіўся ў рэчышчы індыйскіх традыцый, укладу жыцця і нават у многім зліваўся з індуізмам.

# МАСТАЦТВА, ЗВЯЗАНАЕ З БУДЫЗМАМ

Многія цары прыхільна ставіліся да будызму і падтрымлівалі яго, але найбольш гэтым вызначаўся імператар *Ашока*, які жыў у III ст. да н.э. Пра яго варта сказаць больш падрабязна. Гэты цар аб'яднаў многія княствы ў адзіную велізарную магутную імперыю (стымулам, дарэчы, з'явілася знешняя небяспека з боку войскаў *Аляксандра Македонскага*). Спачатку Ашока ствараў сваю дзяржаву сілаю, але аднойчы пасля вялікага бою ён ішоў па полі і з-пад ног яго пачала выступаць кроў – зямля набрыяла ёю. Гэта настолькі ўразіла цара, што ён на ўсё жыццё адмовіўся вырашаць палітычныя праблемы сілаю і з таго часу прызнаваў адзінае заваяванне – заваяванне чалавечай душы вераю і абавязкамі. Менавіта Ашока зрабіў будызм дзяржаўнай рэлігіяй.

Ашоку можна лічыць найвялікшым з цароў Зямлі. Ён забараніў выкарыстоўваць веды і розум для шкодных мэтаў. Пры ім была засякрэчана навука аб прыродзе. Ён заснаваў як быццам самую незвычайную секту ў свеце – больш таемную, чым жрэцтва Егіпта, чым абшчына Піфагора, чым ордэн масонаў. Гэта секта "Дзевяці Невядомых". Многія вучоныя Індыі сур'ёзна вераць у яе існаванне. У кожнага з дзевяці Невядомых захоўваецца Кніга, у якую ў час Ашокі былі запісаны навуковыя звесткі з пэўнай галіны, напрыклад, з астраноміі ці з медыцыны. А разам 9 Кніг складаюць усю мудрасць чалавецтва. Вось ужо амаль дзве з паловай тысяч гадоў Невядомыя шукаюць сабе замену, мяняюцца з пакалення ў пакаленне, праходзячы абрад Пасвячэння.

Ашока паслаў на востраў Цэйлон свайго сына, каб той пасадзіў галінку ад свяшчэннага дрэва Буды, а пазней адправіў і дачку – заснаваць ордэн манашак. Дзеці Ашокі зрабіліся на востраве апосталамі, яны хрысцілі тысячы людзей. Распаўсюдзіўся будызм і на поўнач – у Гімалаі, Манголію, і на ўсход – у Кітай, Карэю, Японію. Пазней ён падзяліўся як бы на дзве часткі – хінаяну і махаяну, "малую калясніцу" і "вялікую калясніцу". Што гэта значыць? Зразумець містычную аснову будызму цяжка. Паспрабуем растлумачыць яе праз паняцці, блізкія нашаму менталітэту. Каб дасягнуць Нірваны, неабходна як бы пераадолець бездань, што аддзяляе іншасвет ад грэшнай зямлі. Пераскочыць яе надзвычай цяжка, а "малая калясніца" (хінаяна) пераносіць толькі самых годных, вартых. Як жа астатнія? Для іх у будызме паступова выспела ідэя "махаяны" або "вялікай калясніцы", а на самой справе – маста праз бездань. Заўважым, што і ў славянаў вясёлка лічылася мастом у іншасвет, у беларусаў жа такім пераходам у Вырай быў Млечны шлях.

Калі будызм у час Ашокі зрабіўся дзяржаўнай рэлігіяй, пачалося вялікае будаўніцтва ў гонар Буды. Існуе нават тэрмін "Мастацтва эпохі Ашокі". Прычым мастацтва будызму зусім не пакідае ўражанне далёкага ад жыцця, змрочнага. Наадварот, яно аптымістычнае, поўнае своеасаблівай радасці, бо смерць не трагедыя, а цікавае падарожжа, новае нараджэнне і, натуральна, новыя ўражанні. Нават канчатковае "растварэнне" ў Нірване не адмяняе жыццё, а ўзводзіць у Абсалют, у Вечнасць кожнае яго імгненне.

Асноўныя архітэктурныя збудаванні эпохі Ашокі наступныя: ступы-капліцы, пад якімі захоўваюцца свяшчэнныя рэліквіі Буды; слупы-калоны, на якіх высякаліся будысцкія казані; храмы ў пячорах, звязаныя з тым перыядам жыцця Буды, калі ён жыў у гарах.

Згадаем, што прах Буды раздзелены на восем частак, аднак Ашока дастаў яго, раздзяліў на 84 000 частак, пахаваў ва ўсіх правінцыях сваёй велізарнай імперыі і над кожнай гэтай, па сутнасці, крупіначкай загадаў узвесці помнікі-ступы. Безумоўна, сёння іх збераглося мала. Самая вядомая – ступа ў Санчы (штат Мадх'я-Прадэш).

Ступа – паўсфера, якая, відаць, сімвалізуе Неба, а значыць, Бясконцасць, але падобная хутчэй да гары. Буда сам вызначыў такую форму сваёй магілы, перавярнуўшы ўверх дном свой кубачак. Пабудаваны ступы з цэглы. Дарэчы, многія выдатныя помнікі ранейшага арыйскага дойлідства не захаваліся, бо арыйцы, паводле традыцыі, вынесенай з прарадзімы, будавалі храмы і палацы з дрэва, якое, натуральна, хутка гніло, разбуралася. (Па той жа прычыне не дайшлі да нас значныя помнікі нашага роднага славянскага мастацтва). Са ступаў пачалася гісторыя ўласна індыйскай архітэктуры, бо вялікія гарады Індскай (Харапскай) цывілізацыі ўсё ж такі заставаліся пад зямлёю. Ступы надзвычай падобныя да курганоў у стэпах Украіны. Праўда, пасярод ступы ўзвышаецца слуп, які сімвалізуе вось Свету – Касмічнае Дрэва.

Ступа ў Санчы пабудавана Ашокам у 250 г. да н.э. на тым месцы, адкуль яго сын Махендра вырушыў на Цэйлон са сваёй прапаведніцкай місіяй[18]. Самае выдатнае ў комплексе Санчы – агароджа вакол ступы і брамы на кожны бок свету. У брамах уражвае дэкаратыўная разьба, якая адлюстроўвае і сцэны з жыцця Буды, і больш раннія міфалагічныя сюжэты. Тут знаходзіць выяўленне, па сутнасці, уся прырода Індыі: звяры, птушкі, дрэвы, кветкі. Асабліва звяртаюць на сябе ўвагу капітэлі ў выглядзе сланоў і духаў прыроды, падобныя да нашых русалак, якія гайдаюцца на

[18] Тулеев С. Искусство Индии. – М., 1988. – С. 96.

галінках дрэў. Увогуле, вобраз жанчыны, непарыўна звязанай з дрэвам, існаваў яшчэ ў Індскай цывілізацыі – у Махенджадара.

Жаночая прыгажосць у Махабхараце і Рамяне апісвалася праз раслінныя вобразы: рукі – вецце, вусны – чырвоныя кветкі. (Але тое ж і ў нашым фальклоры.) Жывёлы на брамах адлюстраваныя таксама паэтычна, ідэалізавана. Гэта таму, што Буда адраджаўся на Зямлі не толькі як чалавек, але і ў выглядзе розных істотаў. Акрамя таго, у Індыі спрадвеку надзвычай шануюць усё жывое, і чалавек зусім не лічыцца вянцом тварэння.

Ступа ў Санчы з'яўляецца шэдэўрам сусветнага мастацтва, бо ў ёй свет паўстае як гармонія: расліны, жывёлы, людзі, духі і багі ўзаемазвязаны шматлікімі повязямі. Падчас знаёмства з комплексам Санчы захапляешся любоўю яго стваральнікаў да прыроды, пакланеннем яе багаццю і магутнасці, разнастайнасці яе формаў.

Эмацыйнасць і ідэя адзінства – важнейшыя рысы індыйскага мастацтва – выяўляюцца і ў слупах, пастаўленых Ашокам на месцах, звязаных з дзейнасцю Буды. У наш час цалкам захавалася дзесяць такіх слупоў, вышыня якіх даходзіць да 15 *м*.

Усе слупы былі ўпрыгожаны шыкоўнымі капітэлямі, з якіх найбольш вядомая – "**Львіная капітэль**", або "Капітэль Ашокі". Слуп з ёю (ён не захаваўся) стаяў на месцы, дзе Буда арганізаваў абшчыну манахаў са сваіх першых вучняў. Капітэль уяўляе з сябе кветку лотаса – улюблёную і найбольш містычную кветку ў Індыі. Над ёю – свяшчэнныя жывёлы (леў, конь, слон і бык зебу), паміж якімі – круг, што сімвалізуе кола кармы, Сонца і Вечнасць. На самым версе – чатыры вялікія львы, якія глядзяць ў розныя бакі свету. Капітэль мае вышыню 2,14 *м*. Яна манументальная і эфектная. Сімволіка яе рэльефаў будысцкая, але карані – у ранейшай культуры Індыі, як і самога будызму. Нагадаем, што паняцце "арый" – саманазва прышлага народа – ужо ў Індыі набыло значэнне "леў", хоць першапачаткова азначала "араты". Таму леў стаў сімвалам і Буды. У свеце няма больш натхнёнага адлюстравання цара звяроў. Невыпадкова, што гэта унікальная скульптура зрабілася гербам Індыі, яе нацыянальнай эмблемай. Сёння адлюстраванне "Капітэлі Ашокі" можна ўбачыць у Індыі ледзь не на кожным кроку.

Найцікавейшай формай старажытнага дойлідства былі пячоры. З часоў Ашокі дайшло восем пячорных храмаў, высечаных у надзвычай цвёрдых горных пародах. Прычым спецыялісты сцвярджаюць, што дойлідства ў пячорах фармавалася пад уплывам арыйскага драўлянага дойлідства, пра якое пакінулі бліскучыя водгукі падарожнікі з Грэцыі і Кітая.

Храм у пячоры – чайцья – гэта трохнефная зала. У канцы цэнтральнага нефа, утворанага двума радамі калонаў, размяшчаецца

маналітная ступа (як алтар). Але асабліва прыцягвае ўвагу фасад храма. Як правіла, уваход надзвычай дэкараваны (мноства скульптурак, калонак, рэльефаў), а над імі – у выглядзе падковы велізарнае "Сонечнае акно". Усё гэта, разам узятае, нагадвае гатычны храм з яго тонкімі калонамі, аркамі і галоўнае – вялікім круглым акном – "ружаю" на фасадзе. Такое ўражанне, відаць, невыпадковае: ужо ў Новы час еўрапейцы, трапляючы ў будысцкія храмы, былі здзіўленыя падабенствам рытуалаў і нават атрыбутыкі ў будыйскай рэлігіі і ў каталіцкай.

Сёння ў пячорных храмах не служаць – будыстаў у Індыі засталося мала. Гэта турысцкія аб'екты. Пасля спякоты зайсці ў пячорны храм, – сапраўды, нібы апынуцца ў Нірване: тут заўсёды прыемны халадок.

У будысцкага мастацтва – вялікі шлях: каля дзвюх тысяч гадоў. Спачатку самога Буду ўвасаблялі ў выглядзе жывёлаў ці кола, а з пачатку нашай эры – і ў чалавечым абліччы: як правіла, у позе "лотаса". Ён паўстае ідэальна прыгожым чалавекам у стане глыбокага сузірання. Лічаць, што скульптуры, дзе Буда адлюстраваны стоячы – уплыў грэцкага антычнага мастацтва, а седзячы – мясцовая традыцыя. Лепшыя з яго скульптураў поўняцца глыбокай духоўнай значнасцю.

Росквіт будысцкага жывапісу звязаны ўжо з іншай дынастыяй – імператараў *Гуптаў* (IV – VII стст.). Пасля Ашокі мастацтва будызму развівалася інтэнсіўна, прычым будаваліся не толькі асобныя храмы, а нават манастыры і гарады, цалкам высечаныя ў гарах. Высякаліся яны на працягу многіх пакаленняў. Тут было і жыллё, і храмы, і школы, і своеасаблівыя музеі. У Індыі ў класічную эпоху створана 1 200 такіх комплексаў. З іх сусветна вядомы – Аджанта (захад Дэкана), дзе архітэктура, скульптура і жывапіс паўстаюць у асабліва гарманічным адзінстве.

Класічныя роспісы ў пячорах Аджанты выкананы ў асноўным у перыяд з II да VII ст. Пячоры знаходзяцца ў абрыве над горнай рэчкай. Пасля заняпаду будызму ў X ст. пра іх забыліся, і яны былі выяўлены толькі ў 1829 г.: хлопчык-пастушок прывёў сюды англійскага афіцэра-паляўнічага. За амаль два стагоддзі пасля пачатку вывучэння пячоры ў значнай ступені разбурыліся, хоць у XX ст. тут працавалі лепшыя італьянскія спецыялісты, якія да таго цудоўна замацавалі роспісы ў Пампеях.

Перыяд праўлення Гуптаў называюць залатым векам індыйскай культуры[19]. Што гэта сапраўды так, дэманструюць

---

[19] Тулеев С. Живопись Аджанты. // Сокровища искусства стран Азии и Африки. Вып. 1. – М., 1975. – С. 19.

пячоры Аджанты: роспісы тут вызначаюцца глыбокай праўдзівасцю і ў той жа час містыцызмам, чалавечнасцю, стрыманасцю ў трактоўцы вобразаў, у перадачы пачуццяў. Тэматыка – жыццё Буды, а асноўная ідэя – мір, дабро, любоў.

Хоць жывапіс захаваўся ў 16 з 29 пячораў, ён уражвае багаццем бытавога, этнаграфічнага, гістарычнага матэрыялу. Адзін толькі прыклад: у жанчын на малюнках можна налічыць 240 розных відаў прычосак! Прыцягваюць увагу сцэны, звязаныя з нараджэннем Буды. Асабліва прыгожая яго маці – Майя. Яе пастава надзвычай выразная, вобраз паэтычны і эмацыйны, хоць твар спакойны. Праўда, заўважаецца некаторая манернасць у позе, але сучаснае вока, прывучанае да топ-мадэляў, успрымае гэта нармальна. Увогуле, мастацтва Аджанты мае хутчэй свецкі, чым рэлігійны характар і па сутнасці глыбока народнае. Яно выяўляе паўнату жыцця, яго адзінства, уражвае любоўю да чалавека і ўсяго жывога.

Хоць будызм узнік у Індыі і з ім звязана такое багатае мастацтва, тут ён не зацвердзіўся, а аказаўся перанесеным у суседнія краіны. У Індыі перамог усё ж індуізм.

## РЭЛІГІІ ІНДЫІ: ІНДУІЗМ

Асноўная рэлігія народа Індыі – індуізм. Яго цяжка параўнаць з якой-небудзь іншай рэлігіяй свету – настолькі ён багаты і глыбокі.

Індуізм фармаваўся многія тысячагоддзі і ўключае ў сябе кірункі, якія нават прэтэндуюць на ролю самастойных рэлігій (напрыклад, джайнізм, крышнаізм). Культура Індыі тым і адрозніваецца ад іншых вялікіх рэгіянальных культур (напрыклад, Егіпта, Грэцыі), што яна захавала практычна ўсе – надзвычай старажытныя – традыцыі. Тут, як нідзе, адчуваецца непарыўнасць сувязі часоў і разнастайнасць шляхоў, што ідуць ад Адзінага Першавытоку. Прасачыць гісторыю фармавання індуізму – значыць, зразумець яго найскладанейшую структуру.

Міфалагічная аснова індуізму – Веды. Згадаем, што гэта помнік арыйскай культуры, і таму яны з'яўляюцца найважнейшай крыніцай вывучэння і нашай уласнай – славяна-балцка-германскай міфалогіі.

Усяго галоўных багоў у Ведах – 33. Паміж імі падзелены тры асноўныя сферы Сусвету (прычым важнейшай лічылася не вышэйшая – Неба, – а прамежкавая – паміж Небам і Зямлёю).

Філасофскай асновай індуізму з'яўляецца **брахмаізм.** Паняцце Касмічнага Абсалюту **Брахмана** сустракаецца яшчэ ў Ведах. Брахман – стваральнік усяго Космасу. Ён не мае антрапаморфных рысаў і ўвогуле не мае нічога канкрэтнага, але ўваходзіць ва ўсе рэчы і з'явы. "Яго дзеянні можна параўнаць са святлом і цяплом, што

ідуць ад агню. Хоць агонь знаходзіцца ў пэўным месцы, яго цяпло і святло распаўсюджваюцца паўсюль. Гэтак жа і Асоба Бога ўсюды разносіць свае энергіі, хаця Ён Сам застаецца ў сваім трансцэндэнтальным доме[20]".

Галоўная кніга брахманізму – **Бхагавадгіта** (Гіта), вялікі помнік індыйскай культуры. І па аб'ёме, і па філасофскай глыбіні, і па ўзросце яе можна параўнаць з Бібліяй.

Паводле Гіты, існуе ўласна адзін толькі Абсалют. Прадметы знешняга свету – вынік дзеяння яго магічнай творчай сілы – майі. Багі, вядомыя яшчэ з Ведаў, лічацца прыватнымі праяўленнямі адзінага касмічнага пачатку – Брахмана, або Абсалюта. Між іншым, падобнае вучэнне існавала і ў Старажытным Егіпце, таму што тут былі як бы дзве рэлігіі: рэлігія жрацоў – адзінабожжа (таемная) і рэлігія народа, што ўключала не менш за 2000 багоў. Вялікі яўрэйскі прарок *Маісей*, заснавальнік індуізму, вынес ідэю адзінабожжа, якая лічылася самым вялікім сакрэтам, якраз з Егіпта, дзе быў вярхоўным жрацом краіны, пра што сведчыць Стары Запавет. Яўрэйскі народ аказаўся здольны успрыняць ідэю адзінабожжа. У самім Егіпце яна, як вядома, не прыжылася, хоць і была зацверджана рэформай фараона *Эхнатона* (XIV ст. да н.э.). У Індыі народ таксама верыў у многіх багоў, што ўвасаблялі розныя прыродныя сілы і стыхіі. Брахманізм – вучэнне надзвычай складанае – на працягу стагоддзяў быў вымушаны змяняць свае канцэптуальныя асновы, каб заваяваць папулярнасць у шырокіх колах насельніцтва. У прыватнасці Гіта, якая дайшла да нашага часу ў даволі позніх спісках III-II стст. да н.э., напісана даходліва, маляўніча, афарыстычна, у форме паэмы, зразумелай і малаадукаваным людзям. Тут упершыню з'явіўся вобраз **Крышны** – у далейшым аднаго з найбольш любімых герояў індыйскага народа. Менавіта постаць гэтага бога дазволіла звязаць складаныя філасофскія паняцці з народнымі вераваннямі і культамі[21].

Асноўны рэлігійны ідэал брахманізму – усёпаглынальная любоў да Бога, а мэта кожнага чалавека – зліццё з Абсалютам. Тым не менш праз вобраз Крышны паэма ўслаўляе і зямное быццё, і зямную любоў. У мастацтве – літаратуры, жывапісе – фармуецца жанр поўнай вытанчанай эротыкі пастаралі, якая апавядае пра вясёлае дзяцінства і юнацтва Крышны на ўлонні чароўнай прыроды сярод прыгожых пастушак. Праўда, Крышна выступае і як герой-змеяборца, што істотна яднае яго з Апалонам – забойцам змея Піфона, з Ярылам – сонечным богам славянаў, з хрысціянскім

[20] Книжка индийского мышления. – Калькутта, 1985. – С. 19.

[21] Бонгард-Левин Г. Древнеиндийская цивилизация. Философия. Наука. Религия. – М., 1980. – С. 130 – 155.

Георгіем Пераможцам і з іншымі арыйскімі героямі – змагарамі з цемрай і хаосам. Дарэчы, некаторыя даследчыкі заўважаюць і падабенства лёсаў Крышны і Хрыста. Крышна, як і Хрыстос, нарадзіўся ў цнатлівай маці, імя якой было **Дэві.** Брахманізм атаясамлівае яе з сусветнай матэрыяй, адухоўленай і аплодненай Богам-Духам. У ідэалогіі брахманізму вобраз Крышны больш узвышаны, чым у народных паданнях.

Адметна, што ў Індыі эратычная сіла, каханне прысутнічае ў рэлігіі, філасофіі, святах, абрадах, літаратуры, жывапісе. У гэтым сэнсе індыйская культура дасягнула вышыні, якой няма ў іншых культурах. Геній народа Індыі заўсёды чэрпаў матывы і вобразы для свайго мастацтва ў багацці пачуццяў чалавека, які знаходзіцца ў гарманічным суладдзі з прыродай. Сэнс вобраза Крышны менавіта ў гэтым, а таксама – у своеасаблівым сінтэзе магіі белай (арыйскай) і чорнай (дравійскай), у зліцці тэізму і пантэізму: Абсалют раствораны ў прыродзе, інакш кажучы – "Бог ёсць прырода".

Тысячагоддзі лепшыя розумы, вялікія мысляры Індыі працавалі над пазнаннем душы і цела чалавека. На жаль, Захад не надаў значэння філасофскім адкрыццям Індыі. У той жа час Захад доўга захапляўся ледзь не дзіцячай верай у цуды, звязаныя з **ёгай**. Безумоўна, практыка індыйскай ёгі – велізарны скарб чалавецтва. Гэта вучэнне можна разглядаць і як самастойнае, і як частку рэлігійнай сістэмы індуізму. На нашу думку, ёга захавала дасягненні ранейшай, яшчэ дапатопнай, цывілізацыі, якая была, хутчэй за ўсё, не тэхнічнай, а біялагічнай: выкарыстоўвала не прылады працы, а ўласна сілы, стоеныя ў самім чалавеку (напрыклад, здольнасць да левітацыі, тэлекінезу). Практыка ёгі якраз валодае методыкай вызвалення гэтых сілаў. Баба-Яга ў нашых казках, магчыма, – рудымент той жа біялагічнай цывілізацыі.

У эпоху Сярэднявечча ў індуізме канчаткова аформілася галоўная трыяда багоў – **Трымурці: Брахма, Шыва, Вішну.** На нашу думку, увогуле ідэя трыадзінства Боскай Існасці прыйшла з Індыі, стаўшы асновай усіх рэлігій. Праўда, спярша ў тры інкарнацыі Бога ўваходзіў жаночы пачатак: Бацька – Бог-Дух, Маці – Матэрыя-Прырода, сын – Крышна. І першыя хрысціяне шанавалі жаночую сутнасць Бога ў выглядзе галубіцы пад імем Святога Духа. Пасля Царква згубіла ключ да старажытных містэрый. Усюды, у тым ліку ў Індыі, урэшце зацвердзілася мужчынская мадэль, пры гэтым функцыі багоў размеркаваліся наступным чынам: Брахма – стварае, Шыва – разбурае, Вішну – зберагае.

Брахма – чысты Дух. Вішну адпавядае свету чалавечаму і ўвасабляе Душу, а Шыва – Цела, свет Прыроды. Трымурці ўяўлялася як адно цела з трыма галовамі. Дарэчы, у славянаў,

знойдзены скульптуры божышчаў таксама з трыма і з чатырма галовамі.

У індуізме ранейшыя старажытныя арыйскія багі, трохі мадыфікаваныя, выступаюць пад іншымі імёнамі. Па-новаму іх і ўшаноўвалі. Па-першае, былі забаронены ахвярапрынашэнні жывёлаў (яны захаваліся толькі ў некаторых плямёнаў). Па-другое, індуізм стымуляваў мастацкае адлюстраванне багоў (адсюль – узлёт мастацтва, перш за ўсё скульптуры і жывапісу). Багоў часта адлюстроўвалі мнагарукімі і мнаганогімі. Суправаджалі іх, як правіла, пэўныя жывёлы. Такія багі былі блізкія і зразумелыя простаму чалавеку. Згадаем, што ў Егіпце многія багі самі мелі галовы жывёлаў і птушак.

На сённяшні дзень Брахма ў Індыі не вельмі шануецца. Для брахманаў-жрацоў ён застаецца абстракцыяй, разлітай у прыродзе. Праўда, народ і яго ўяўляе канкрэтна (у бога нават ёсць жонка – Сарасвацi). Але лічыцца, што Брахма знаходзіцца недзе вельмі далёка, на Небе, дзе ён пагружаны ў сузіранне. Ва ўсёй вялікай Індыі не набіраецца і дзесяці храмаў, прысвечаных Брахму. Згадванне яго імя на першым месцы сярод іншых багоў – толькі ўмоўная ветлівасць, даніна традыцыі.

Сучасны індуізм раздзелены на два асноўныя кірункі – **шываізм** і **вішнуізм.** Шыва генетычна ўзыходзіць да арыйскага бога Рудры (руды). Перайшлі да яго і функцыі Індры, а таксама, у рэшце рэшт, і Брахмы. Акрамя таго, Шыва ўвабраў у сябе мноства дробных божышчаў розных плямёнаў і таму існуе ў розных мадыфікацыях. Вобраз гэтага бога надзвычай супярэчлівы. Праваслаўная царква лічыць яго індыйскім д'яблам. Сапраўды, адна з функцый Шывы – разбурэнне. Але разбурае ён пераважна ўсё старое і тым самым спрыяе дыялектычнаму працэсу развіцця, руху наперад. У апошні час у гэтым вобразе ўсё больш выходзяць на першы план стваральныя функцыі. Шыва разумеецца як сімвал мужчынскага пачатку ў Космасе, увасабленне творчай сілы Прыроды. Жанчыны Індыі ў храмах Шывы просяць дзяцей, бо ён дапамагае зачаццю. Як сімвал творчага руху Шыва паўстае ў танцы. Танцуючы, ён жывіць сваёй энергіяй Космас, дае яму энергію для існавання, пачатку шматлікіх працэсаў, у тым ліку зачацця жывых істотаў. Менавіта таму ў краіне заўсёды надавалі выключную ўвагу рытуальным танцам у храмах Шывы. Пазней харэаграфія зрабілася адным з найбольш развітых відаў мастацтва ў Індыі.

Шыва выступае і як змагар з дэманамі. Вось тут ён якраз і паўстае выключна знішчальнікам, які сваім трэцім вокам на лбе спапяляе ворагаў. У рытуалах шываізму пастаянна прысутнічае

матыў нараджэння і пагібелі Сусвету. Гэта бог, які ўвабраў у сябе самую глабальную філасофскую ідэю – ідэю жыцця-смерці.

Жонка Шывы – **Парваці** – дачка Гімалаяў. Існуе прыгожы міф пра тое, як Парваці закахалася ў Шыву, калі ён быў яшчэ аскетам-ёгам, і спакушала яго з дапамогай індыйскага Амура – бога Камы[22]. Парваці вядомая ў розных постацях, у тым ліку страшнай забойцы, гнеўнай і злоснай багіні знішчэння і смерці **Калі.**

У Шывы і Парваці былі сыны. Найбольш любімы ў народзе – **Ганеша** – бог з чалавечым целам і галавою слана. Слон лічыцца ў Індыі мудрэйшым за чалавека. Ганеша шануецца як бог вучонасці, кніжнасці, мастацтва.

Вобраз трэцяга бога Тройцы-Трымуці – **Вішну** – сустракаецца яшчэ ў Ведах. На нашу думку, ён узыходзіць да старажытнага арыйскага бога Вішаня – сімвала вясны, новага года, вечнай сілы абнаўлення. Вішну мяккі, добры (пры гэтым свавольнік, гарэза, жартаўнік) і найбольш блізкі з усіх багоў да людзей. Асноўная яго функцыя – ахоўная, але і ў ім абраны абавязкі многіх божышчаў. Жонка Вішну – багіня прыгажосці і кахання **Лакшмі.** Дарэчы, яна, як і Венера, нарадзілася з марской пены. Для Вішну і Лакшмі характэрна не палымяная страсць, як у Шывы з Парваці – такая, што зямля трасецца, – а вельмі пяшчотнае, узвышанае, самаахвярнае каханне. Вішну, як і Шыва, можа выступаць у розных інкарнацыях, прымаць шматлікія формы (аватары). Асноўных форм – 9. Сярод іх жывёлы, Рама, Крышна, Буда (гэтая ідэя дапамагла індуізму ўвабраць у сябе і будызм). Асабліва любімы народам Вішну ў вобразе Крышны. У яго гонар складаюцца песні, драмы, а вясною адзначаецца надзвычай вясёлае свята, у час якога маладыя людзі свавольнічаюць, гойдаюцца на арэлях, мажуць адзін аднаго рознымі фарбамі, пырскаюцца вадою. Праўда, у Індыі народ схільны лічыць усіх выдатных асобаў увасабленнем Вішну. Бясспрэчна, гэта адзін з самых прывабных рэлігійных вобразаў у сусветнай культуры.

## МАСТАЦТВА ІНДЫІ ЭПОХІ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

У эпоху Сярэднявечча (з V-VII стст.) у Індыі стваралася ўсё менш будысцкіх храмаў. Найвыдатнейшы помнік гэтага часу – "Чорная пагада" або **Храм Сонца** ў Канараку. Храм незвычайны тым, што пабудаваны ў выглядзе калясніцы, ён – на колах, безумоўна, не гумовых. Гэта высечаныя з каменя барэльефы, па шэсць з кожнага боку храма. Сем каменных коней (ад іх засталіся толькі п'едэсталы) імчалі храм-калясніцу насустрач Сонцу, у акіян (храм размешчаны на беразе Бенгальскага заліва).

[22] Парнов Е. Кольца Змея. – М., 1996. – С. 249 – 251.

Да часу будаўніцтва гэтага храма будызм быў ужо далёка не галоўнай рэлігіяй Індыі. Многія фактары – сацыяльна-грамадскага і ідэалагічнага характару – абумовілі перамогу індуізму ў дзвюх яго асноўных формах: шыванізму і вішнуізму. Новая рэлігія знайшла сваё ўвасабленне ў мастацтве – у архітэктуры, скульптуры, жывапісе.

На працягу некалькіх стагоддзяў у краіне ішло шырокае храмавае будаўніцтва. Індыйскай архітэктура развівала думку пра тое, што горад і дом магічна ўплываюць на жыццё людзей. Індуізм, нягледзячы на ўсе расавыя і каставыя адрозненні, імкнуўся стварыць са сваіх вернікаў адзіную сям'ю і пасяліць яе ў адным доме – горадзе. Індыйскі горад суадносіўся з будовай Сусвету, усяго Космасу і таму ўяўляў з сябе складаную, але вельмі дакладную структуру. Будынкі размяшчаліся так, каб яны ўтваралі сімвалічную фігуру[23].

Кожны індуісцкі храм увасабляе "цэнтр свету", сусветную гару Меру, дзе сыходзяцца сферы Неба, Зямлі і Падзем'я. У храмавых комплексах прысутнічае і слуп як сімвал Сусветнага Дрэва, і пячора як чэрэва Зямлі, і брама як прасторавая мяжа, што аддзяляе космас ад хаосу, дом ад наваколля. Праўда, усе элементы-сімвалы ёсць і ў будысцкіх храмах і ступах.

Індыйскія храмы падзяляюцца на дзве вялікія групы: "нагара" – паўночны стыль і "дравіда" – паўднёвы стыль. Але зручней адрозніваць храмы па тыпу даху: закругленыя, пірамідападобныя, цыліндрычныя, бочкападобныя. Яны, відаць, паходзяць ад арыйскіх буданоў, палатак, полагаў з тканіны ці дрэва над алтарамі.

Зыходная ідэя ўсіх храмаў з закругленым дахам – квадрат зямлі, у які ўпісаны круг неба. Найпрыгажэйшыя храмы гэтага тыпу – у штаце Арыса, які называюць "музеем пад адкрытым небам". Самы вядомы тут храмавы комплекс – у Каджураха (XI ст.). Ён з'яўляецца шэдэўрам сусветнага дойлідства і шырокавядомы ў заходнім свеце. Адносна невялікія, храмы аздоблены скульптурнымі дзеямі ў асноўным эратычнага зместу – своеасаблівымі ілюстрацыямі да **Кама-Сутры,** эратычнага трактата, які на Захадзе разумеецца як падручнік па тэхніцы сексу, а на самой справе з'яўляецца глыбокай філасофскай працай. Каханне паміж мужчынам і жанчынай лічылася ў Індыі праяўленнем найвышэйшага парыву да зліцця з Абсалютам, сімвалам яднання чалавека і Бога.

У Каджураха турысты аказваюцца як бы ў іншым свеце – у "царстве любові", дзе можна атрымаць новыя ўяўленні пра сваё быццё. Гэта дзіўная сімфонія каменнай музыкі кахання. На досвітку

[23] Вистара. Архитектура Индии. – Бомбей, 1987. – С. 14 – 54.

і ўвечары скульптуры нібы ажываюць, прыходзяць у рух: дрыжаць, варушаць рукамі, а твары пад промнямі сонца ўсміхаюцца. Цікава, што храмы ўпрыгожаны скульптурамі звонку, а знутры зроблена імітацыя пячоры: пустэча, прахалода і паўзмрок, у якім свецяцца свечкі ды лампадкі.

З 85-ці храмаў Каджураха збераглося толькі 22. Але і тыя, што засталіся, з'яўляюцца унікальнымі помнікамі культуры, якія нельга параўнаць ні з чым у свеце.

Прынцып упрыгожання толькі вонкавага захоўваецца і ў храмах-пірамідках з як бы адсечанымі вяршынямі. Найбольш тыповыя скульптуры на фасадзе перадаюць 108 позаў класічнага індыйскага танца. Надзвычай багатае вонкавае аздабленне храма рэзка кантрастуе з пячорнай атмасферай усярэдзіне яго. Прычым, калі ў храмы Шывы дапускаюцца іншавернікі, то храмы Вішну чамусьці зачыненыя для неіндуістаў, і таму невядома, што там унутры.

Найбольш грандыёзныя храмы Шывы – падземныя комплексы ў Элоры і на востраве Элефанта, побач з Бамбеем.

Храм у Элоры (VIII ст.) высечаны непасрэдна ў гары. Паводле міфа, на гэтай гары жыве сам Шыва са сваёй жонкай Парвацї. Сёння нам нават цяжка ўявіць, якая тытанічная праца спатрэбілася для стварэння такога комплексу. У двары галоўнага храма прыцягвае ўвагу велізарная скульптура слана – шэдэўр анімістычнага жанру.

Элефанта – што азначае "слон" – назва вострава пасярод Бамбейскай гавані. Гэта адзін з самых вядомых турысцкіх аб'ектаў у краіне. Ён таксама створаны ў VI – VIII стст. Як і ў Элоры, тут раскінуўся пячорны горад. Складаныя шматскульптурныя кампазіцыі падземных залаў літаральна зачароўваюць, прымушаюць чалавека засяродзіцца на глыбінях сваёй падсвядомасці.

Усяго ў Індыі каля 1200 падземных, пячорных гарадоў, храмаў, манастыроў. За пяцьсот гадоў бурнага развіцця індыйская храмавая архітэктура назапасіла каласальны эстэтычны вопыт, выявіла ўзвышаныя імкненні чалавечага духу.

Архітэктура Індыі непарыўна звязана са скульптурай. Такога глыбокага сінтэзу мастацтваў няма нідзе ў свеце. Прыкладна з IX ст., акрамя манументальнай, развівалася камерная скульптура з бронзы. Найвыдатнейшы шэдэўр гэтага мастацтва – **Шыва Натараджа** (Шыва – "цар танца"). У рэпертуары бога – не менш за 108 танцаў (108 – свяшчэнная лічба, якая атрымліваецца з перамнажэння наступнага раду I х 2 х 2 х 3 х 3 х 3). Скульптура Шывы прызнаная

знакамітым французскім скульптарам *Агюстам Радэнам* "самым выдатным у свеце адлюстраваннем рытмічнага руху"[24].

Шыва адлюстраваны на сваёй чароўнай гары ў Гімалаях, дзе ён жыве з жонкай. Правай нагою бог абапіраецца на злога дэмана-карла – увасабленне невуцтва і ўсяго злога, ліхога ў жыцці. Сам жа Шыва – цар ведаў, сімвал творчага парыву, руху наперад. З дэмана як бы прарастаюць закругленыя галінкі Сусветнага Дрэва з лістамі, якія адначасова з'яўляюцца і языкамі полымя, што ўтвараюць нібы вогненнае кола – німб вакол Шывы. У сваім танцы Шыва творыць свет і адначасова разбурае. Трыццаць пасмаў раскіданых валасоў сімвалізуюць энергію, што зыходзіць ад бога. Жэсты рук "рыфмуюцца" з рухам ног і выгібам цела і настолькі дасканалыя, што чатыры рукі здаюцца натуральнымі. Твар як быццам бясстрасны, але геніяльны скульптар акрэсліў на ім ледзь прыкметную загадкавую ўсмешку. Два вока Шывы – сонца і месяц, а трэцяе – галоўнае – агонь. Цела і шыю бога кольцам абвіваюць кобры.

Чым больш углядаешся ў гэты шэдэўр, тым больш здзіўляешся яго сэнсававай ёмістасці і мастацкай выразнасці. Скульптура Шывы Натараджы – сімвал творчага парыву і абсалютнага руху ў абсалютнай нерухомасці. У сусветным мастацтве цяжка знайсці больш змястоўны ў філасофскім сэнсе вобраз. Акрамя таго, гэта найлепшае абагульненае адлюстраванне бога ў яго сусветнай функцыі.

Сваім мастацтвам індуізм сцвярджаў любоў да Абсалюту, веру ў актыўнасць Бога на Зямлі, а таксама надзею на добрае пераўвасабленне пасля смерці.

## КУЛЬТУРА ІНДЫІ Ў ІСЛАМСКІ ПЕРЫЯД

Мусульманскія заваёўнікі ўжо ў VIII ст. даходзілі да межаў Індыі, але толькі праз 500 гадоў здолелі заваяваць краіну. Захопнікі-фанатыкі разбурылі мноства помнікаў нацыянальнага мастацтва. У XIII-XIV стст. мусульманскія дынастыі на тэрыторыі Індыі змянялі адна другую. Утварылася вялікая колькасць дробных княстваў, якія пастаянна ваявалі паміж сабою. Распаўсюджванне ў краіне ісламу выклікала глыбокія змены ў змесце і формах індыйскага мастацтва. Іслам нанёс непапраўную шкоду перш за ўсё скульптуры і жывапісу, бо забараняў адлюстраванне жывых істотаў. Але ў архітэктуры ўрэшце адбылося зліццё старажытнаіндыйскіх мастацкіх тэндэнцый з тым творчым стылем, які сцвярджаўся ісламскай канцэпцыяй Бога, грамадства, чалавека.

[24] Искусство стран Востока. – М., 1986. – С. 176.

Іслам – рэлігія адзінабожжа, як іудаізм і хрысціянства. У адрозненне ад індуізму, які набліжае зямное да нябеснага, іслам сцвярджае, што паміж Богам і чалавекам ляжыць бездань. Ісламскі храм – мячэць – гэта месца для чалавечага імкнення ўвысь, да недасягальнага ідэалу. Таму храмы мусульманаў падобныя да ракетаў, што імкнуцца адарвацца ад грэшнай зямлі.

Менавіта ракетаю выглядае адзін з першых помнікаў ісламскага мастацтва – мінарэт **Кутуб-Мінар** у Дэлі, створаны прыкладны ў 1230 г. Вышыня каласальнага слупа – больш за 70 *м*. Чатыры балконы раздзяляюць яго на некалькі ярусаў, якія паступова памяншаюцца ў напрамку ўверх. У ісламскім дойлідстве існуе толькі адзін яшчэ больш высокі мінарэт – у Каіры (Егіпет). Прызначэнне Кутуб-Мінара спрэчнае. Магчыма, ён будаваўся не толькі для склікання вернікаў на малітвы, але і як помнік у гонар перамогі, прычым узводзіўся паводле індыйскіх традыцый (згадаем слупы Ашокі). Дарэчы, літаральна побач з Кутуб-Мінарам знаходзіцца шэдэўр індыйскга мастацтва – **Жалезная калона,** створаная, як мяркуюць, у пачатку нашай эры і прысвечаная богу Вішну. Выклікае здзіўленне тое, што калона, якая прастаяла шмат стагоддзяў, абсалютна не заіржавела. Сакрэт старажытных металургаў так і не раскрыты. Некаторы час лічылася, што калона зроблена з метэарытнага жалеза, цяпер ёсць версія зямнога паходжання матэрыялу. Помнік выклікае намнога большую цікавасць турыстаў, чым у дзесяць разоў вышэйшы за яго Кутуб-Мінар. Да калоны заўсёды стаіць чарга. Існуе павер'е, што калі стаць да яго спіною і сцяць за ёю рукі, – будзеш шчаслівы і багаты. Некаторым мужчынам з доўгімі рукамі гэта ўдаецца.

Толькі ў XVI ст. уладары з дынастыі Вялікіх Маголаў аб'ядналі шматлікія княствы ў адзіную імперыю, якая існавала да XVIII ст. – да захопу Індыі Брытаніяй. Заснавальнік дынастыі Бабур паходзіў з Магалістану (так называлася тады тэрыторыя Сярэдняй Азіі). З імперыяй Вялікіх Маголаў звязаны найвышэйшы ўзлёт інда-ісламскага мастацтва.

Першым шэдэўрам гэтага сінтэзу стаў горад **Фатэхпур-Сікры,** пабудаваны ў 1569 г. самым вядомым з Маголаў шахам *Акбарам* недалёка ад Агры. Лепшыя дойліды Індыі і Персіі стварылі геаметрычна правільны, падобны да гарадоў старажытнай Індскай цывілізацыі, комплекс. Ён адметны незвычайным багаццем формаў, як бы нават гульнёй з формамі, і фенаменальнай дэкаратыўнай раскошай. Шах жыў тут толькі пятнаццаць гадоў, пасля чаго пераехаў у іншае месца. Горад з таго часу не заселены, але цудоўна захаваўся. Сёння ён нагадвае своеасаблівы "горад духаў", які ўражвае фантастычнасцю і літаральна незямною прыгажосцю.

Паколькі вялікі шах Акбар імкнуўся да аб'яднання краіны, ён праяўляў увагу да індыйскага мастацтва. Таму ў перыяд яго ўладарання ў архітэктуры ўсё ж пераважала індыйская традыцыя (або ў сінтэзе з персідскай). Нашчадкі Акбара аддавалі перавагу ісламскім архітэктурным формам. Узлёт культуры Вялікіх Маголаў адбыўся ў час праўлення шаха *Джахана*. Вяршыня дасягненняў гэтай пары – шэдэўр сусветнага дойлідства, найвялікшы ў гісторыі помнік каханню – маўзалей **Тадж-Махал** каля Агры.

Шах Джахан, як і яго дзед Акбар, меў схільнасць да архітэктуры. Ён сам карэкціраваў праект грабніцы для сваёй любімай жонкі *Мумтаз*. Асноўная задума Тадж-Махала належала візантыйскаму турку, вучню слыннага турэцкага архітэктара *Сінана*, грэка па паходжанні, які пабудаваў самыя велічныя і прыгожыя помнікі Стамбула. Але ў распрацоўцы праекта бралі ўдзел і майстры Індыі, Персіі, Сярэдняй Азіі, Аравіі. Дойліды хацелі, каб і першы, і тысячны раз маўзалей уражваў, зачароўваў, выклікаў хваляванне, здаваўся цудам.

Дарога да маўзалея ідзе ўздоўж цудоўнага басейна, дзе растуць лотасы і плаваюць залатыя рыбкі. Беламармуровае збудаванне раскінулася над платформай з чырвонага пясчаніку. Па вуглах маўзалея на вышыню 42 *м* узнімаюцца чатыры стройныя мінарэты. Лёгкасць помніка падкрэсленая адмысловай муроўкай. Усе чатыры фасады маўзалея абсалютна аднолькавыя і ўяўляюць з сябе каласальны партал з аркаю вышынёй 20 *м*. Незвычайна лёгкі велізарны белы купал у Індыі называюць "воблакам, што застыла на паветраным троне".

У Тадж-Махале 300 памяшканняў, якія ўражваюць фенаменальна тонкай разьбою па мурмары, інкрустацыяй з каштоўных камянёў. Калісьці маўзалей будавалі для адной Мумтаз. Сёння тут знаходзіцца і грабніца самога шаха Джахана. Абодва саркафагі – цуд мастацтва дэкору, гравіроўкі і інкрустацыі. Яны ўпрыгожаны сімвалічным арнаментам, у якім можна ўбачыць і Сусветнае Дрэва, і касмалагічную сімволіку (пакуль не ўсе элементы арнаменту расшыфраваны). Уражвае гарманічная еднасць Тадж-Махала з прыродай. У розны час дня, у розную пору года, у рознае надвор'е помнік здзіўляе сваім незвычайным выглядам, уласцівасцю дзіўна суадносіцца з пастаянна зменлівым небам. Тадж-Махал – не толькі найвышэйшы ўзлёт індыйскага мастацтва, але і ўвогуле адна з вышыняў усёй чалавечай культуры.

Пра майстэрства індыйскіх мастакоў на Усходзе складалі легенды, ды і на Захадзе Індыя вядомая як краіна цудаў. Нягледзячы на тое, што іслам забараняў выявы жывых істотаў, жывапіс не загінуў – ён прыняў іншыя формы. У старажытнасці пераважаў

манументальны жывапіс. Згадаем цудоўныя роспісы храмаў Аджанты. Фрэскі былі характэрныя і для іншых пячорных храмаў. З IX ст. развівалася мастацтва індыйскай мініяцюры (бадай, лепшай у свеце).

Мініяцюра – форма камернага жывапісу. Па сутнасці, гэта народны лубок, для якога характэрныя добрая прамалёўка, яркая каляровая гама і пэўная ўмоўнасць у абмалёўцы персанажаў. Асабліва вядомыя **Магольская** школа мініяцюры, якая склалася хоць і пад уплывам персідскага жывапісу, але ўсё ж на аснове мясцовых традыцый. У XVII ст. асноўным жанрам магольскай мініяцюры быў партрэт. Мастакі імкнуліся не толькі перадаць індывідуальныя рысы чалавека, але стварыць яго псіхалагічную характарыстыку. Заўважым, што ўвага да ўнутранага свету асобы – характэрная прыкмета культуры Індыі, якая выявілася яшчэ ў вялікіх літаратурных арыйскіх эпасах – Махабхараце і Рамаяне.

У XVIII ст былі папулярнымі анімалістычныя матывы з глыбокай філасофскай асновай. Напрыклад, сімвалічнае адлюстраванне кругазвароту сусвету выглядае такім чынам: сучаснасць (карова) корміць будучыню ў выглядзе цяляці. Развівалася жанравая мініяцюра. Любімы сюжэт у гэты час звязаны з вобразам Крышны і яго каханай Радхі. Характэрныя для жывапісу Маголаў таксама ілюстрацыі да Махабхараты і Рамаяны.

Магольская мініяцюра належыць да вышэйшых дасягненняў сусветнага мастацтва. Цікавасць да яе абудзілася ў перыяд Індыйскага нацыянальнага Адраджэння – на пачатку XX ст.(дарэчы, тады ж, калі і ў Беларусі). Вучні найвыдатнейшага дзеяча Бенгальскага Адраджэння – пісьменніка і мастака *Рабіндраната Тагора* – аднавілі традыцыі магольскага жывапісу, якія перарваліся з канца XVIII ст. у выніку каланізацыі Індыі Англіяй.

На працягу пяці тысячагоддзяў (ажно з Індскай цывілізацыі) Індыя зберагала высокія духоўныя запаветы продкаў і нават перадавала іх іншым краінам. Таму разуменне мастацтва Індыі – гэта ключ да разумення ўсяго Усходу.